Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

14 ЛЮТАГА 2008 г.
ЧАЦВЕР
№ 29 (26142)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Сёння — «прамая лінія»

«ПРАЦОЎНЫЯ» ЗАКОНЫ: ЁСЦЬ ПЫТАННІ?

Кантракты, выпрабавальны тэрмін, гарантыі маладым спецыялістам, водпускі, тэрміны выплаты зарплаты, працоўны час і ўмовы працы, нарэшце, некаторыя асаблівасці новага Працоўнага кодэкса — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда» з удзелам **намесніка дырэктара дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ірыны Фёдараўны ШЫЛЯЕВАЙ.** «Прамая лінія» пройдзе **сёння з 16.00 да 17.30 па тэлефонах: (8 017) 292 38 21 і 292 38 92.**

Савет Рэспублікі даў згоду на прызначэнне новых кіраўнікоў Канстытуцыйнага Суда і Генпракуратуры

Учора прайшло пасяджэнне дзевятай пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу. Падчас пасяджэння члены верхняй палаты парламента далі згоду на прызначэнне старшынёй Канстытуцыйнага Суда Пятра Міклашэвіча, а Генеральным пракурорам — Рыгора Васілевіча.

Прадстаўляючы Пятра Міклашэвіча, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Папкоў адзначыў, што былы кіраўнік Генпракуратуры «добра вядомы як чалавек з багатым прафесійным і жыццёвым набыткам». Пад яго кіраўніцтвам «органы пракуратуры эфектыўна рэалізоўвалі паўнамоцтвы па ажыццяўленні нагляду за законнасцю ў розных сферах» і «абароне правоў і свабод грамадзян».

На думку Аляксандра Папкова, Пётр Міклашэвіч на новай пасадзе будзе садзейнічаць «станаўленню ў Беларусі прававой дзяржавы і сапраўднага народаўладдзя. Бо канстытуцыйнае правасуддзе — найважнейшы элемент дэмакратычнай дзяржавы».

Гаворачы пра сваю дзейнасць на новай пасадзе, Пётр Міклашэвіч адзначыў, што Канстытуцыйны Суд «будзе рашуча спыняць спробы дзяржаўных органаў як у нарматворчай, так і ў правапрымяняльнай практыцы неапраўдана ці несуразмерна абмяжоўваць правы і свабоды грамадзян». Таксама суддзі Канстытуцыйнага Суда «будуць больш актыўна выяўляць» і прадпрымаць усе прадугледжаныя заканадаўствам меры па «адмене прававых актаў, якія перашкаджаюць дзеянню нормаў Канстытуцыі».

Прадстаўляючы Рыгора Васілевіча на новай пасадзе, Аляксандр Папкоў заявіў, што былы кіраўнік Канстытуцыйнага суда «змог наладзіць працу суда ў няпросты для краіны час» на прынцыпах «адкрытасці, узаемадаверу і адказнасці».

Аляксандр Папкоў таксама выказаў упэўненасць, што Рыгор Васілевіч зможа «накіраваць пракурорскі корпус на дасягненне высокіх вынікаў, як таго нязменна патрабуе Прэзідэнт».

У сваю чаргу Рыгор Васілевіч заявіў, што сёння «патэнцыял пракуратуры недастаткова рэалізаваны». Так, у краіне застаецца высокім узровень злачыннасці. «Хоць ён і знізіўся летась, мы яшчэ застаёмся далёка ад паказчыка 2001 года». Акрамя таго, на думку Рыгора Васілевіча, праводзіцца недастатковая праца па прафілактыцы правапарушэнняў. Да таго ж больш пільнай увагі патрабуе ўзровень раскрыцця злачынстваў.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Беларусь — Еўропа

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сваім Указам адобрыў падпісанне Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Камісіяй Еўрапейскіх таварыстваў аб заснаванні, прывілеях і імунітэтах Прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх таварыстваў у Рэспубліцы Беларусь. На падпісанне пагаднення ўпаўнаважаны намеснік Міністра замежных спраў Валерый Варанецкі. Пагадненне будзе часова прымяняцца з моманту падпісання да яго ўступлення ў сілу.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ААТ «Газпрам» набыло чарговы пакет акцый ААТ «Белтрансгаз»

ААТ «Газпрам» стала ўласнікам 25 працэнтаў акцый ААТ «Белтрансгаз», паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці Беларусі. «Газпрам» заплаціў 31 студзеня $625 млн за 12,5 працэнта акцый.

Твае правы

НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ ПІСАЦЬ ЗАЯВЫ НА... ЗВАЛЬНЕННЕ

Трэцяя частка сутак на адпачынак, трэцяя — на хатнія справы і трэцяя — на работу. Прыкладна такую «раскладку» мае пераважная большасць з нас, прынамсі, з панядзелка па пятніцу, таму нездарма менавіта «працоўная тэма» традыцыйна была і застанецца актуальнай. Прычым, калі складаць своеасаблівы «рэйтынг» папулярнасці, то першыя месцы ў ім займуць пытанні кантрактаў, водпускаў і часу выплаты зарплаты. І пераканацца ў гэтым давялося ў чарговы раз у Талачынскім раёне — падчас «выязной прыёмнай» спецыялістаў Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Менш за год? Патрэбна згода

Як вядома, рашэнне працягваць ці не кантракт пасля заканчэння яго тэрміну найперш залежыць ад наймальніка. Кіраўнік мае поўнае права «пакінуць» работніка або развітацца з ім, і пры гэтым без якіх-небудзь дадатковых тлумачэнняў. Між тым, ці магчымы тут «сярэдні варыянт» — падпісаць новы кантракт, але... менш чым на год?

— У дадзеным выпадку могуць быць дзве сітуацыі, — адзначае намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Ірына Шыляева. — Калі заканчваецца кантракт на найбольшы 5-гадовы тэрмін, то яго трэба толькі перазаключаць і пры гэтым — як мінімум на год. Аднак калі кантракт быў падпісаны тэрмінам да 5 гадоў, то яго можна працягнуць. І тут ужо не выключаецца верагоднасць працягу працоўных адносінаў менш чым на год. Аднак вырашаць гэта пытанне ў «аднабаковым парадку» наймальнік не мае права — вызначыць такі час дзеяння кантракта можна выключна на падставе пісьмовай заявы самога работніка.

Кожнаму — свае ўмовы

Два чалавекі працуюць побач, маюць аднолькавую кваліфікацыю і вопыт. Ці могуць у іх «не супадаць» умовы кантрактаў? І ці могуць аднаму работніку зменшыць вызначаны працэнт прэміі, а іншаму — не?

— Кантракты з'яўляюцца індывідуальным дагаворам, таму, па логіцы, іх умовы аднолькавымі для ўсіх быць не могуць, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — Што ж да прэмій, то трэба мець на ўвазе наступнае. Звычайна такі від выплат рэгулюецца непасрэдна кантрактамі і палажэннем аб аплаце працы кожнай арганізацыі. Прычым у палажэнні павінна ўказвацца, за што і ў якім памеры могуць здымацца пэўныя прэміі. Таму сітуацыя, калі аднаму штосьці «знялі», а іншаму — не, сапраўды можа ўзнікнуць. І, калі наймальнік кіруецца палажэннем аб аплаце працы, ніякіх парушэнняў тут не будзе. Да слова, варта заўважыць, што кожны мае поўнае права ведаць дакладныя ўмовы ўласнага кантракта. Кантракт павінен складацца ў двух экзэмплярах, прычым другі — абавязкова даецца работніку «на рукі». У адваротным жа выпадку вінаватай службовай асобе пагражае адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу ад 4 да 20 базавых велічынь.

Калі сам — гэта прагул

Папрацаваў — не спадабаліся ўмовы. І ўзнікла жаданне змяніць месца работы. Праўда, трэба мець на ўвазе, што аднаго жадання тут можа быць мала. Нашмат прасцей, калі быў заключаны бестэрміновы працоўны дагавор. У такім выпадку трэба падаць заяву, прасачыць, каб яе зарэгістравалі і пачакаць максімум месяц — пры любой раскладцы за гэты час наймальнік абавязаны падшукаць замену.

Складаней, калі пры прыёме на работу заключаўся кантракт, тэрмін якога з'яўляецца абавязковым як для наймальніка, так і для работніка. І тут ці не адзіная магчымасць «пайсці раней» — дасягнуць узаемнай дамоўленасці.

Праўда, ёсць і яшчэ адзін шлях развітання — парушэнне наймальнікам сваіх абавязкаў. Але тут зноў-такі існуюць свае нюансы.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

У закон аб СМІ неабходна ўнесці змяненні

У Беларусі для забеспячэння больш поўнай абароны правоў журналістаў наспела неабходнасць унесці некаторыя папраўкі ў закон аб сродках масавай інфармацыі. Такую думку ў размове з карэспандэнтам БЕЛТА выказаў старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Юрый Кулакоўскі.

«Паводле існуючага сёння закона, на журналіста могуць падаць у суд праз 10 і праз 20 гадоў пасля выхаду ў свет яго публікацыі. Павінен быць устаноўлены тэрмін даўнасці для звароту ў суд таго, каго не задавальняе публікацыя, напрыклад, на працягу года», — лічыць парламентарый.

Пажадана таксама, дадаў ён, стварыць у рэспубліцы пэўны кодэкс паводзінаў журналіста. «Мы, напэўна, яшчэ не дайшлі да гэтага, але гэта трэба рабіць. Журналіст павінен разумець, што мяне можна здымаць у рабочым кабінеце ў час выканання службовых абавязкаў, але не трэба здымаць, калі я наведваю гастраном, і паведамляць чытачам, што я там купляю», — адзначыў Юрый Кулакоўскі.

«Я лічу, што больш свабодных сродкаў масавай інфармацыі, чым дзяржаўныя, няма. Мы цудоўна разумеем, што той, хто плаціць, той і заказвае музыку. Дзяржаўным СМІ не паступае спецыяльных заказаў некага «раскруціць» або некага абліць граззю за канкрэтныя канверты грошай», — сказаў дэпутат.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Напярэдадні Дня святога Валянціна паліцыя нораваў Саудаўскай Аравіі забараніла гандаль чырвонымі ружамі і іншымі прэзентамі, якія звычайна дораць каханым, перадаюць інфармагенцтвы.

Камісія па заахвочванні дабрадзейнасці і прадухіленні распусты — так афіцыйна называюцца ахоўнікі парадку ў Саудаўскай Аравіі — загадала зняць з продажу гэтыя кветкі і падарункавую ўпакоўку. Свята, калі ў многіх краінах закаханыя дораць адно аднаму падарункі, улады палічылі прычынай для пазашлюбных адносінаў, якія ў Саудаўскай Аравіі караюцца законам. Закаханыя наладжваюць спатканні ў больш ліберальных суседніх Бахрэйне або Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Цэны на ружы на чорным рынку ўжо падскочылі. Некаторыя саудаўцы з надзеяй адвесці ад сябе падазрэнні афармілі заказы ў кветкавых магазінах за шмат дзён і нават тыдняў да свята

Кар. БЕЛТА.

Ёсць нагода

Хавайся, хто можа — ВАЛЯНЦІН ІДЗЕ!..

Дзень высокіх цэнаў, перапоўненых кавярняў і рэстаранаў, мілых, мала каму сапраўды патрэбных дробязяў а-ля 58-я ваза для сурвэтак, мяккіх цацак, ювелірных вырабаў «з намёкам» і мноства гатовых ці (значна радзей) самаробных паштовак усіх адценняў чырвонага — ад пяшчотнага колеру кветак шыпшыны да насычана-вішнёвага. Цікава, ці гэта меў на ўвазе рымскі святар Валянцін, які ў III стагоддзі нашай эры вянчаў маладыя пары?

Валянціна, пазней залічанага ў гладзілі б. Дый з дачкой турэмшчыка Джуліяй, як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі, усё не так проста — яна была найлепшым кандыдатам, каб дапамагчы арганізаваць уцёкі з турмы... Зрэшты, цалкам магчыма, што ўсё гэта падкопы скептыкаў — а Валянціна ўсё адно праз 200 гадоў назвалі Святым апекуном усіх закаханых, і дзень прызнанняў у каханні адзначаецца ва ўсім свеце.

Скажам, у Англіі здаўна існавала традыцыя апранаць дзяцей у дарослых, а малыя хадзілі з дома ў дом і спявалі песні пра святога Валянціна — практычна калядавалі, толькі «даніну» збіралі выключна салодкую. Ва Уэльсе выразалі драўляныя «лыжкі кахання», упрыгожвалі іх ключамі, замочнымі адтулінамі, сэрцайкамі — і дарылі гэткую «інструкцыю па пошуку шляхоў да сэрца» закаханым. Першыя пісьмовыя «валянцінкі» з'явіліся пазней — адну з такіх паштовак, што захоўваецца ў Брытанскім музеі, даследчыкі датуюць XV стагоддзем.

Аднак чым далей, тым меней магчыма стала спыніць і стрымаць рэкламны сэнс і маркетынгавыя акалічнасці свята. Ужо ў XVII стагоддзі, напрыклад, пры тым самым брытанскім дварэ склалася завядзёнка, што 14 лютага жанчына магла падысці да ўпадабанага кавалера і прапанаваць узяць яе ў жонкі, а мужчына не мог пакрыўдзіць даму адмовай; у выпадку ж, калі яго сэрца было ўжо занятае, у якасці адступнога жанчына абавязкова (!) атрымлівала ў падарунак шаўковую сукенку. Шырокая душа амерыканцаў патрабавала шырокіх жэстаў — нявестам на Дзень св. Валянціна дасылаліся марцыпаны, якія каштавалі вельмі дорага. Для тых, хто хацеў крыху зэканоміць, знаходлівыя фабрыканты наладзілі вытворчасць карамелі. Дарэчы, менавіта амерыканцам мы абавязаны з'яўленнем тэматычных набораў цукерак у скрынках формы сэрца — бізнэс гэты прыбытковы і зараз. Гэтаксама ў Японіі традыцыя суправаджаць «валянцінку» салодкім падарункам з'явілася з падачы буйнога вытворцы шакаладу. Але горш за ўсё давялося жыхарам Францыі — там у сувязі са святам актывізаваліся ювеліры, і цяпер не падарыць сваёй пары якое-небудзь упрыгажэнне — прымета дурнога тону. З XIX стагоддзя і вытворчасць саміх «валянцінак» стала серыйнай, і замест таго, каб самому мучыцца начамі, складваючы з першых літар у радках акравершу імя «палавінкі», людзі з задавальненнем выкарысталі «шырспажыў». Сёлета штогод толькі ў ЗША прадаецца больш як 190 мільёнаў «валянцінак», а па прыбытковасці вытворцы называюць 14 лютага другім пасля Калядаў.

Не, зразумейце правільна: сапраўдным пачуццям ніякія магазінныя стандартныя наборы не перашкодзяць. І, напэўна, нам рана аднаўляць Анты-Валянцінаў дзень і дарыць адно аднаму чорныя жабіліся пакутнікі, цяпер лічаць ледзьве не анёлам-ахоўнікам закаханых сэрцаў. А як жа — герой, нягледзячы на афіцыйную забарону, тайна вянчаў маладых людзей і дзяўчат, і нават калі за гэта трапіў у турму, пакінуў за сабой рамантычны след — закахаўся ў дачку турэмшчыка і пакінуў ёй ліст з прызнаннем у каханні... Аднак, паклаўшы руку на сэрца (даруйце за каламбур), калі разабрацца, не так усё проста. Тагачасны рымскі імператар Юлій Клаўдзій, які забараніў юнакам жаніцца, зусім не быў злодзеем і ненавіснікам жанчын. Бо забарона распаўсюджвалася толькі і выключна на маладых, годных да службы ў арміі — а які ў салдатаў баявы дух, калі дома маладая жонка чакае, а тое і з дзіцем. Так што святы Валянцін, сучаснай мовай кажучы, элементарна дапамагаў юнакам... «адкасіць» ад службы. Яго і ў наш час за гэта, пагадзіцеся, па галаве не паглобныя шарыкі або печыва ў выглядзе разбітага сэрца з надпісам «Ты што, жартуеш?» ці «Нават не думай!». Але сапраўдныя пачуцці, між іншым, не маюць патрэбы ў афіцыйным дазволе і асобным дні, каб быць выказанымі. Да таго ж, напрыклад, The Times сцвярджае, што такога паняцця, як «удалы Дзень святога Валянціна», увогуле не існуе. Тыя, хто жыве «няпарна», адчуваюць сябе ў гэты дзень як мінімум іншапланецянамі і пакутуюць ад адзіноты. Тыя, хто знаходзіцца ў працэсе выбару, уцягваюцца ў «спаборніцтва», хто каму зробіць найлепшы падарунак ці прынясе найшыкоўнейшы букет. І нават людзі, у якіх асабістае жыццё наладжана, міжволі параўноўваюць пачуцці партнёра з нейкімі навакольнымі прыкладамі. А рэальны чалавек, пагадзіцеся, заступае ў рамантычнасці ідэальным кніжным або кінаперсанажам... Таму, каб не ставіць на паліцу тую 58-ю вазу для сурвэтак, не хаваць падалей з вачэй дарагі скураны рэмень, які не спалучаецца са штанамі, і не паказваць штучную радасць, атрымліваючы пошлы плакат «1001 прычына, чаму я цябе кахаю», можа, варта проста перачакаць яго, гэты канкрэтны дзень? А прызнавацца ў каханні, не забываючыся пра любоў увогуле, і рабіць нечаканыя рамантычныя сюрпрызы паспрабуйце ў астатнія 364 — не, сёлета нават 365 — дзён года. І не толькі гэтага.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА 1 ТЫС. МУЖЧЫН ПРЫПАДАЕ 1143 ЖАНЧЫНЫ,

прычым у гарадах — 1148, у сельскай мясцовасці — 1128. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

Па стану на 1 студзеня 2008 года колькасць жанчын склала 5168,4 тыс., або 53,3 працэнта агульнай колькасці насельніцтва. З агульнай колькасці жанчын 3799,6 тыс., або 73,5 працэнта, пражывалі ў гарадскіх паселішчах і 1368,8 тыс., або 26,5 працэнта, — у сельскіх населеных пунктах. У 2007 годзе прадоўжылася тэндэнцыя росту абсалютнай колькасці шлюбаў. У мінулым годзе было заключана 90,4 тыс. шлюбаў, або 9,3 шлюбу на 1000 насельніцтва (у 2006 годзе — 8,1 шлюбу на 1000 насельніцтва). Разам з тым павысіўся і ўзровень разводаў. У 2007 годзе было зарэгістравана 36,1 тыс. разводаў, што на 4,3 тыс. разводаў больш, чым у 2006 годзе. У разліку на 1000 насельніцтва ў 2007 годзе прыпадала 3,7 скасавання шлюбу, у 2006 годзе — 3,3.

У Беларусі скарачаецца агульны каэфіцыент смяротнасці насельніцтва. Калі ў 2006 годзе гэты паказчык склаў 14,2 чалавека на 1000 насельніцтва, то ў 2007 годзе — 13,7 чалавека. У гарадах і гарадскіх паселішчах агульны каэфіцыент смяротнасці знізіўся з 10,7 чалавека на 1000 насельніцтва да 10,4 чалавека, у сельскай мясцовасці, адпаведна, з 23,6 чалавека на 1000 насельніцтва да 22,5 чалавека.

Смяротнасць дзяцей ва ўзросце да 1 года склала 5,2 чалавека на 1000 народжаных жывымі супраць 6,1 у 2006 годзе. Найбольш высокі ўзровень дзіцячай смяротнасці адзначаны ў Гомельскай вобласці (6,9 чалавека на 1000 народжаных), найбольш нізкі — у горадзе Мінску (3,9 чалавека).

МЯСНЫ САЛОН

Жыхар Гродна «нашпігаваў» свой аўтамабіль польскімі мяснымі вырабамі і спрабаваў незаконна ўвезці ў нашу краіну.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, нягледзячы на тое, што ў пункце пропуску «Брузгі» машына рухалася па «зялёным» канале, дзе звычайна не праводзіцца агляд транспартных сродкаў, на гэты раз памежнікі вырашылі зазірнуць у аўтамабіль. Інтуіцыя вартавых мяжы не падманула. Пад абшыўкай салона яны знайшлі кантрабандныя мясныя прадукты агульнай вагой 137 кілаграмаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

СТРЭЛІЎ «ЖАРТАМ» І ТРАПІЎ У МІЛІЦЫЮ

Гэта — пра аднаго беспрацоўнага (1982 года нараджэння) з Рагачова. Прагульваўся ён, як паведамілі ў прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, па беразе ракі Друць сярод белага дня з пнеўматычнай вінтоўкай і нечакана ўбачыў маладую жанчыну з яе 14-гадовай дачкой. Яны таксама прагульваліся. Жартам, як ён потым казаў у міліцыі, ён узяў ды і стрэліў, тым самым нанёсшы дзяўчынцы рану. А за той «жарт» зараз давядзецца адказваць. На поўным сур'ёзе...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАДЛЕТКІ «ШТАМПАВАЛІ» ФАЛЬШЫЎКІ

Амаль адначасова ў Чашніках і Слоніме праваахоўнікі злавілі за руку падлеткаў, якія займаліся падробкай беларускіх рублёў.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка, у Чашніках «засвяціліся» вучні адной з новалукомльскіх школ, якія спрабавалі збыць у гандлёвых кіёсках несапраўдныя 20-тысячныя купюры Нацбанка. Як высветлілася ў ходзе разбору, забяспечыў іх падробленай наяўнасцю адзінаццацікласнік, які «штампаваў» фальшыўкі пры дапамозе камп'ютарнай тэхнікі ў сябе дома. У Слоніме ж аператыўнікі затрымалі адразу трох падлеткаў, якія анагічным чынам вырабілі 13 падробленых 20-тысячных, адну дзесяці- і адну пяцітысячную банкноты. Між іншым, гэтым хлопцам удалося нават збыць свае «тварэнні» ў гандлёвых аб'ектах: устаноўлена 14 фактаў збыту фальшывак.

Паводле інфармацыі Алега Слепчанкі, сёлета ў краіне зарэгістравана ўжо 157 выпадкаў фальшываманетніцтва з беларускімі рублямі. Летась жа прыкладна кожны сёмы з 1838 выяўленых выпадкаў падробкі грошай быў звязаны з нацыянальнай валютай: найбольшай папулярнасцю ў «саматужнікаў» карысталіся купюры вартасцю 10 і 20 тысяч рублёў. Дарэчы, калі за ўвесь 2007 год была спынена дзейнасць 29 груп фальшываманетчыкаў, то за месяц з невялікім сёлета — ужо 7, якія, як адзначаюць у міністэрстве, «камплектаваліся» выключна са школьнікаў і студэнтаў.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКАЯ ПАЛІЦЫЯ ЗАЦІКАВІЛАСЯ РАПТОЎНАЙ СМЕРЦЮ ПАТАРКАЦЫШВІЛІ

У Лондане ва ўзросце 52 гадоў памёр вядомы бізнэсмен, былы кандыдат у прэзідэнты Грузіі і даўні сябар Барыса Беразоўскага Бадры Патаркацышвілі, абвешчаны ў вышук Генпракуратурамі Расіі і Грузіі. Паліцыя брытанскага графства Сурэй разглядае раптоўную смерць грузінскага бізнэсмена і палітыка як падазроную.

Паводле брытанскай Times Online, ускрыццё павінны былі правесці ўжо ўчора. Бадры Патаркацышвілі памёр 12 лютага каля 23.00 у сваёй віле ў прыгарадзе Лондана. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай смерці стаў сардэчны прыступ. У той жа час у асяроддзі Патаркацышвілі адзначаюць, што бізнэсмен ніколі не пакутаваў ад сардэчных захворванняў.

ПАСЛЯ ЗАЯВЫ ПУЦІНА АБ РАКЕТАХ ЮШЧАНКА ПАГАДЗІЎСЯ НА РЭФЕРЭНДУМ ПА ЎСТУПЛЕННІ Ў НАТА

Украіна правядзе рэферэндум па пытанні аб уступленні ў НАТА, заявіў прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка. «Мы павінны разумець, што гэтае пытанне датычыцца кожнага з нас», — сказаў ён. Змена пазіцыі адбылася на наступны дзень пасля перамоў у Крамлі, па выніках якіх Пуцін агаломшыў грамадскасць пагрозамі нацэліць на Украіну ядзерныя ракеты ў выпадку ўступлення краіны ў Альянс.

Юшчанка адзначыў, што 97 працэнтаў украінцаў не інфармаваныя аб тым, што такое Паўночнаатлантычны альянс, таму не варта спяшацца да ўступлення ў гэтае аб'яднанне. «Акрамя таго, украінскі бок ніколі не дапусціць узнікнення пытанняў, якія могуць ускладніць адносіны з Расіяй», — дадаў прэзідэнт Украіны. Юшчанка таксама заявіў, што Украіна гатовая заканадаўча замацаваць забарону на размяшчэнне ваенных баз НАТА на сваёй тэрыторыі. «Калі расійскі бок турбуецца аб ваенных базах, то Украіна ніколі не пойдзе на гэта, — сказаў Юшчанка.

Нагадаем, у аўторак на прэс-канферэнцыі па выніках пасяджэння расійска-ўкраінскай міждзяржкамісіі прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін прызнаўся, што «падумаць страшна» аб такім развіцці палітычных падзей, калі расійскія ракеты будуць нацэленыя на Украіну. Аднак падобны сцэнарый «тэарэтычна нельга выключаць» пасля магчымага ўступлення Украіны ў НАТА.

КОСАЎСКІ СІМФАНІЧНЫ АРКЕСТР РЭПЕТУЕ «ОДУ ДА РАДАСЦІ»

З косаўскіх крыніц стаў вядомы дакладны «расклад» мерапрыемстваў па абвяшчэнні незалежнасці краю, які юрыдычна з'яўляецца складовай часткай Рэспублікі Сербія.

Паводле графіка, у нядзелю 17 лютага косаўскі парламент заявіць аб намеры абвясціць незалежнасць, затым звернецца да Еўрасаюза з просьбай аб замене грамадзянскай прысутнасці ААН еўрапейскай, а ў сакавіку абвесціць незалежнасць. Затым, а магчыма і раней, адбудзецца прызнанне Косава незалежнай дзяржавай з боку ЗША, Вялікабрытаніі, Францыі, Германіі, Італіі і шматлікіх іншых краін. Падрыхтоўка да гэтай падзеі ідзе апераджальнымі тэмпамі. Як паведамляе «Незалежная газета», спехам сабраны косаўскі сімфанічны аркестр рэпетуе «Оду да радасці» Бетховена, бо гімна ў новай дзяржавы яшчэ няма.

Паводле інфармацыі з дыпламатычных крыніц, паслы 27 краін — удзельніц Еўрасаюза канчаткова ўзгаднілі ў панядзелак на сустрэчы ў Брусэлі дэталі місіі ў Косаве. У Еўропе незалежнасці Косава пярэчаць толькі Сербія, Расія і Кіпр. У сераду Расія падтрымала заклік Сербіі склікаць экстраннае пасяджэнне Савета Бяспекі ААН у сувязі з сітуацыяй у Косаве, якая выклікае занепакоенасць.

У БРЫТАНСКІХ СУПЕРМАРКЕТАХ РАСПУДЖВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ УЛЬТРАГУКАМ

Крамы, паліцэйскія ўчасткі і дзяржаўныя ўстановы Вялікабрытаніі пачалі выкарыстоўваць адмысловы прыбор для адпуджвання дзяцей і падлеткаў, піша The Times.

Ультрагукавая прылада пад назвай «Маскіт» выдае высокачастотны піск, які ў 90 працэнтах выпадкаў не чуюць людзі пасля 25 гадоў. Падлеткі і дзеці, у сваю чаргу, знаходзяць гук вельмі раздражняльным.

Як паведамляе выданне, прыладу набылі сеткі супермаркетаў, у тэставым рэжыме «Маскіт» выкарыстоўваюць таксама McDonald's і адна з крамаў Marks & Spencer. Паводле слоў камерцыйнага дырэктара фірмы — вытворцы прылады, з укараненнем «Маскіта» памяншаецца колькасць крадзяжоў, продажы павялічваюцца і прыбытак расце. Ён растлумачыў рост прыбыткаў тым, што, калі вакол няма падлеткаў, дарослыя пакупнікі адчуваюць сябе больш камфортна і ахвотней робяць пакупкі.

У НАРВЕГІІ ДАЗВОЛІЛІ СПАЛЬВАЦЬ СЦЯГІ ІНШЫХ ДЗЯРЖАЎ

Нарвежскі парламент прыняў закон, які дазваляе жыхарам краіны спальваць сцягі іншых дзяржаў.

Палітыкі, якія выступілі ініцыятарамі прыняцця гэтага законапраекта, лічаць, што спальванне сцяга — прымальная форма самавыяўлення. Правам спальваць нацыянальны сцяг нарвежцы валодалі і раней.

З днём народзінаў, з юбілеем шчыра віншуем намесніка міністра сувязі і інфарматызацыі краіны **Ніну Сямёнаўну ГАЎРЫЛАВУ!** Жадаем

Жадаем быць заўжды багатай,
Багатай – шчасцем і спакоем,
Здароўем, радасцю ў сям'і,
Сябрамі вернымі, любоўю
І ўсім прыгожым на зямлі!

Звяздоўцы.

Сообщение о том, что ОАО «АСБ Беларусбанк» с 11 февраля 2008 года изменил процентные ставки по вновь выдаваемым кредитам физическим лицам на потребительские нужды, **считать недействительным.**

ОАО «Паритетбанк» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) повторно проводят открытый аукцион по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.

Номер лота	*Номер машиноместа*	*Общая площадь, кв. м*	*Начальная цена, бел. рубли*	*Сумма задатка, бел. рубли*
4.	4.	11.9	8 499 992	849 999
5.	5.	11.9	8 499 992	849 999
9.	13.	12.2	8 714 277	871 428
11.	17.	12.5	8 928 563	892 856
12.	20.	12.5	8 928 563	892 856
14.	22.	12.5	8 928 563	892 856
15.	27.	12.5	8 928 563	892 856
16.	28.	12.5	8 928 563	892 856
17.	29.	11.7	8 357 135	835 714
18.	30.	11.7	8 357 135	835 714
27.	45.	10.6	7 571 421	757 142
28.	46.	10.2	7 285 707	728 571

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота и плата за участие в аукционе в размере 4 базовых величин (140 000 белорусских рублей) перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. ***Аукцион состоится 22 февраля 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.*** Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 21 февраля 2008 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 25.01.2008.

Телефоны для справок:
227 48 36, 227 40 22 – УП «Минский городской центр недвижимости»

УНП 190398583.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион

по продаже здания склада (об. пл. 463,4 кв.м, железнодорожная ветка), расположенного: Пуховичский район, г. п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 198 240 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,0723 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.01.2008 г. Аукцион состоится **11 марта 2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10 марта 2008 г**. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Телефон (8017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08029

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 148,00
1 еўра	3 126,84
1 латвійскі лат	4 491,37
1 літоўскі літ	905,07
1 чэшская крона	122,41
1 польскі злоты	866,76
1 расійскі рубель	87,09
1 украінская грыўня	424,65

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,6655
10 UAH	48,3400
1000 BYR	11,4690
EUR	35,9006

Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.02.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009



ЧЫГУНАЧНЫ ПРЫПЫНАК «ЯКУБА КОЛАСА»

Чыгунка дзеліць вёску Люсіна на дзве часткі — новую і Коласаву. У якой з іх правёў два настаўніцкія гады будучы класік, аўтар трылогіі «На ростанях», здагадацца няцяжка. Але для кожнага люсінскага жыхара незалежна ад таго, у якім крыле населенага пункта ўзведзена яго хата, імя Якуба Коласа — аднолькава роднаснае, блізкае, яно — як нязгасная лампада, агеньчык якой не толькі для вачэй, болей — для душы…

Знаходзячыся на Коласавым Палессі, хацелася глыбей унікнуць у сутнасць люсінскага побыту, знайсці самае цікавае для фота, змястоўныя сюжэты, тыпажы. Але ехаў сюды не спецыяльна, проста «дазволіў» сабе звярнуць на паўгадзінкі. І цяпер гэтаму вельмі рады. Першы раз быў, а памяць — на ўсё жыццё! І пра дбайнага гаспадара Паўла Хілюціча (на здымку), і пра мемарыяльныя дошкі (іх у вёсцы дзве), і пра новабудоўлі (хоць і не традыцыйнай тамтэйшай архітэктуры), і пра чыгунку, і, нарэшце, пра бяскрайнія абсягі «Палескай глушы».

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.
Ганцавіцкі раён.



У 1928 ГОДЗЕ Ў ЧЭРВЕНІ ЖЫЎ… ХАІМ СУЦІН

Апошнім часам пануе вялікая цікавасць да асобы знакамітага мастака, ураджэнца сённяшняга гарадскога пасёлка Смілавічы Чэрвеньскага раёна Хаіма Суціна. Яго, яшчэ нядаўна практычна невядомага на радзіме, мы адкрываем нанова. Творчасць, факты біяграфіі — усё ў падрабязнасцях з'яўляецца ў газетах, часопісах, Інтэрнэце. Хтосьці проста цікавіцца яго жыццём, пошукамі свайго «я», а хтосьці грунтоўна вывучае.

Пярэчанні апошніх я прадбачу. Маўляў, як мог Хаім Суцін у 1928 годзе апынуцца ў Чэрвені, калі ён з 1912-га (паводле іншых звестак — з 1913-га) — у Парыжы?! І дакладна вядома, што мастак «засвяціўся» там — у год папярэдні і наступны. Дык я і не спрачаюся. Сапраўды, у 1927-ым у адной з парыжскіх галерэй адбылася персанальная выстава Хаіма Суціна. А ў 1929-ым пабачыла свет першая кніга пра яго творчасць. Так што ў 1928-ым ён не мог жыць у Чэрвені.

Так, не мог… Размова ідзе пра… цёзку, а можа і родзіча. Цёзку толькі па імені і прозвішчы. Адшукалася гэтае цікавае супадзенне зусім выпадкова — у «Кнізе аб нараджэннях», якая захоўваецца ў архіве аддзела ЗАГС Чэрвеньскага райвыканкама. Калі я рыхтавала матэрыял да 90-годдзя гэтай установы, то выпадкова ўбачыла арыгінальны запіс.

Магчыма, ёсць на Беларусі раёны, якім пашчасціла мець старадаўнія архівы. Мо, нават царкоўныя. Нашыя, на жаль, згарэлі падчас Вялікай Айчыннай. А тое, што мы сёння маем кнігі аб нараджэннях, шлюбах і смерцях амаль васьмідзесяцігадовай даўнасці, — сапраўдны цуд.

У сярэдзіне мінулага ўжо стагоддзя з Мінскага дзяржаўнага архіва даслалі паасобныя лісты запісу актаў грамадзянскага стану за 1928 год, і тое не ўсе. Тагачасная загадчыца ЗАГСа ЁўдакіяМашкевіч цярпліва складала і сшывала іх у кнігі. Паспрыяла захаванню архіва загадчыца ЗАГСа з амаль трыццацігадовым стажам Ганна Сасункевіч. А зараз ім удзячна начальнік аддзела ЗАГС райвыканкама Юлія Еліна. Яна — сённяшняя захавальніца запісаў старажытных і не вельмі.

Але вернемся да «Кнігі нараджэнняў» за 1928 год, якая значыцца пад № 1. Вось ён, той ліст, што прыцягнуў увагу. 10 мая 1928 года ў Суціна Хаіма Еселявіча (не Саламонава, а так зваўся бацька мастака-цёзкі) і Суцінай Іткі Беркаўны ў г. Чэрвені нарадзілася дачка Фаня.

Нетаропка перагортваю старонкі. Яны пажаўцелі ад часу, але запісы (во дзіва!), здаецца, зроблены ўчора. Гэта ж трэба, якое раней было якаснае чарніла! У кнізе — ці не ўсе яго адценні: сіняе, блакітнае, фіялетавае і нават чырвонае.

І аддрукаваныя радкі, і рукапісныя — па-беларуску. Вось слова «блізнюкі» — блізняты. А нацыянальнасцяў колькі (патрэбнае падкрэслівалася): «беларус, велікарус, яўрэй, паляк, украінец, латыш, немец, татарын, армянін, грузін, кіргіз, мардвін, башкір, чуваш, вацяк (?), узбэк, туркмэн, таджык або іншае». Шмат варыянтаў і ў графе «сацыяльнае становішча»: «утрыманец (і адпаведнікі жаночага роду), гаспадар, рабочы, батрак, селянін, саматужнік, служачы, вольнай прафесіі, гандляр або іншае». Насупраць графы «подпіс заяўніка» часта сустракаецца: «непісьменны». На круглай пячатцы, якой замацоўваецца акт, выразна прачытваецца: «Чэрвеньскі гарадскі савет Менскай акругі». А імя па бацьку тады пісалася, як «чый»: Ігнатаў, Язэпаў, Рыгораў, Тодараў, Станіслававa… Што датычыцца прозвішчаў, то яны такія ж, як і зараз: Зазека і Ахрамовіч, Мурашка і Сушкевіч, Грыбок і Цыгановіч, Расолька, Сцяжко, Карнач…

Выклікае цікавасць і «Кніга аб шлюбу» таго ж 1928 года. Апрача дашлюбных і пасляшлюбных прозвішчаў, даты нараджэння, абавязкова патрэбна было ўказаць: «калі браўся шлюб, каторы раз бяруць шлюб, сямейны стан (не быў у шлюбе, удавец, разлучаны, мае некалькі дзяцей), нацыянальнасць, адрас шлюбных пасля шлюбу». Падпісваліся і пад наступным: «Заяўляем: 1) шлюб бяром дабравольна, 2) шлюбныя ўмовы, паказаныя ў арт. 66—70 кодэкса законаў аб ЗАГС, нам вядомы і перашкод няма, 3) аб стане здароўя мы ўзаемна паведамлены, арт. 155 Крымінальнага кодэкса нам аб'яўлен».

Але найбольшую цікавасць выклікае радок «прад'яўленыя дакументы». Чаго тут толькі няма! «Метрычная спраўка, сяброўскі білет саюза «Працасветы», спраўка Грабянецкага с/с, заява бацькоў, па даручэнні сведкаў, па подпісе паручыцеляў, вайсковы білет» і самае загадкавае — «службовая чырвоная кніга 5-га стралковага палка».

Што было ў наступныя гады, схавана за заслонай гісторыі. І паднялася яна толькі ў 1944-ым — пасля вызвалення Беларусі. З гэтага часу ў ЗАГСе захоўваюцца ўсе запісы. А ўсяго архіўных кніг тут — 446. Цікава параўнаць «Кнігу аб нараджэннях» 1944 года з 1928-ым. Тут ужо зусім іншая форма актаў. Уверсе — надпіс: «Народны камісарыят унутраных спраў СССР. НКУС БССР — аддзел актаў грамадзянскага стану». Радкі па-ранейшаму на беларускай мове, а вось запісы зроблены па-руску. Але тым жа якасным чарнілам.

З аднаго дакумента бачна, што ў маці нарадзілася сёмае дзіця. Подпіс — загадчыка бюро ЗАГС. У радку насупраць бацькі часта сустракаецца: «убитый в боях немецкими оккупантами», «застрелен немцами», «в рядах Красной Армии» і нават «мать дать сведения об отце отказалась». А вось дзіўны радок: «Перерегистрация немецкого документа». Значыць, немцы выдавалі даведкі аб нараджэнні?

Разглядаю запісы актаў аб шлюбе 1944 года. «Адрас уступаючых у шлюб пасля шлюбу». У абаіх — «вайсковая часць №….». У наступнай пары — «Масква, Малая Палянка». Відавочна, проста ішлі яны тут пасля вызвалення Беларусі і распісаліся. Цікава, як склаўся лёс маладажонаў? Ці выжылі? Ці прынёс шчасце шлюб, зарэгістраваны ў нашай вольнай ад акупантаў краіне? І зноў пытанні, на якія няма адказу.

…Неацэнныя звесткі хаваюцца за дзвярыма шафы. Эх, каб хоць бы адным вокам зірнуць на царкоўна-прыходскія кнігі! Можа, яны ўсё ж захаваліся дзесьці ў мінскіх (ці нават замежных) архівах? І чакаюць свайго другога нараджэння?

…А што датычыцца сапраўднага мастака, дык у аўторак на яго радзіме ў Смілавічах адбылося ўрачыстае адкрыццё экспазіцыі «Пастора Хаіма Суціна».

Святлана АДАМОВІЧ.
Чэрвеньскі раён.

Дапаможам будаваць храм

У Жыткавічах будзе ўзведзены храм у гонар святіцеля Феадосія Чарнігаўскага, як заявілі на закладцы яго мурою благачынны Тураўскай царкоўнай акругі, протаіерэй Генадзь Хаткевіч і намеснік старшыні райвыканкама Валянцін Карпаў.

Яны звярнуліся да прысутных з просьбай узяцца за будоўлю ўсёй грамадой, на агульную карысць унесці свой пасільны і матэрыяльны ўклад у важную справу. Дарэчы, дзеці, слухачы нядзельнай царкоўнай школы, сабралі з вернікаў ужо 2 млн 580 тыс. рублёў ахвяраванняў, усе матэрыялы для ўзвядзення падмуркаў выдзеліла адкрытае акцыянернае таварыства «Сатурн-1», а работы выконвае калектыў мясцовай МПМК-97. Інфармацыйную падтрымку будоўлі забяспечвае раённая газета «Новае Палессе».

Кошт аб'екта складзе 1 млрд 900 млн рублёў. Сабраць такую суму пад сілу толькі ўсёй грамадзе. ***Таму для ўсіх ахвотнікаў дапамагчы царкве і сабе ў аддзяленні ААТ «Белаграпрамбанк» у г. Жыткавічы адкрыты разліковы рахунак для ахвяраванняў 3015204910010, УНП 401148221, код 936.***

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы будзе свая мастацкая галерэя «Універсум». Тут будуць экспанавацца творы не толькі «купалаўцаў», але і іх калег з іншых ВНУ, гродзенскіх мастакоў.

Першая экспазіцыя будзе прадстаўляць работы загадчыка кафедры выяўленчага мастацтва ГрДУ Аляксандра Ляшчынскага, члена Беларускага саюза мастакоў, удзельніка і лаўрэата шматлікіх выставак у нашай краіне, а таксама ў Польшчы, Літве, Германіі, Італіі. А прыкладна праз месяц у галерэі адкрыецца выстаўка «Падарожжа ў краіну Хайку». Дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва, член Федэрацыі еўрапейскіх мастакоў Аляксандр Ларыёнаў прапануе ўвазе наведвальнікаў свае ілюстрацыі да паэзіі японскага паэта XVII стагоддзя Мацуа Басё.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Рэпарцёр атрымаў заданне…

…ПАМЯНЯЦЬ ПРАФЕСІЮ

У Гродне больш за паўтары тысячы вакансій на любы «густ» і, вядома ж, з рознай зарплатай

Так бывае ў жыцці, што чалавек аказваецца на раздарожжы і даводзіцца альбо мяняць месца працы, альбо шукаць занятак зусім не па спецыяльнасці. Наколькі ж гэта рэальна ва ўмовах канкрэтнай тэрыторыі, у дадзеным выпадку — горада Гродна? Карэспандэнт «Звязды» высветліў, што на сёння ў абласным цэнтры больш за паўтары тысячы вакансій, прычым не толькі радавых выканаўцаў, але і кіраўнікоў самага рознага ўзроўню, галоўных інжынераў і намеснікаў начальніка. Адпаведна спецыяльнасці і зарплата, якая можа не дасягаць і двухсот тысяч рублёў, а можа і перавышаць паўтара мільёна.

Калі ў 2003 годзе ў сярэднім па Гродзеншчыне службы занятасці прапанавалі каля 2,2 тысячы вакансій, то цяпер — 4,2—4,4 тысячы ў месяц. Але дзе канкрэтна можна ўладкавацца на працу і на якіх фінансавых умовах?

«Падарожжа» па рынку працы пачнём з рабочых прафесій, якія складаюць прыкладна 75 працэнтаў ад агульнай колькасці вакансій у горадзе над Нёманам. Такое ўражанне, што паралельна з развіццём сістэмы вышэйшай адукацыі, (а гэта далёка не заўсёды запатрабавана існуючымі рэаліямі і прагнозамі на перспектыву ў той ці іншай сферы дзейнасці), усё больш абвастраецца праблема з кадрамі рабочых, падае іх прэстыж. І сапраўды, хіба ж у школах і гімназіях, гаворачы аб эфектыўнасці свайго навучальнага працэсу, часта ставяць у прыклад выпускніцу, якія сталі не вядомымі кіраўнікамі, навукоўцамі, спартсменамі, а высакакласнымі станочнікамі, будаўнікамі, слесарамі па рамонце аўтамабіляў?

Тое, што рабочых у Гродне не хапае, відавочна нават па аб'явах у «бягучым радку» тэлебачання альбо ў мясцовых газетах: «Патрабуюцца…». Канкрэтныя маштабы гэтага дэфіцыту ацаніць цяжка, аднак звесткі гарадскога ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне даволі красамоўныя. І асабліва што датычыцца будаўнічых спецыяльнасцяў. Дык вось, на 1 лютага мелася 80 вакансій муляра (зарплата 350 тысяч—1,5 мільёна рублёў), 30 — страхара (550 тыс.—1 млн руб.), 25 — маляра (320—800 тыс. руб.), 77 — аблiцоўшчыка-плітачніка (450 тыс.—1 млн руб.), 70 — тынкоўшчыка (350 тыс.—1 млн руб.), 61 — электрагазазваршчыка (200—840 тыс. руб.). Гэта зімой, а вясною і асабліва летам попыт на спецыялістаў будаўнічага профілю традыцыйна ўзрастае ў некалькі разоў.

У такой сітуацыі будаўнікі і самі часта прапануюць свае паслугі на старонках рэкламнай прэсы, шукаючы найлепшы варыянт працаўладкавання. А ў Гродзенскім будаўнічым ліцэі разам са службай занятасці арганізавана перападрыхтоўка кадраў. За даволі кароткі тэрмін той жа эканаміст з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якому цяпер практычна немагчыма знайсці працу па спецыяльнасці (паводле апошніх звестак, у вобласці беспрацоўнымі афіцыйна зарэгістраваны 78 эканамістаў, 156 бухгалтараў, 105 настаўнікаў, больш за 60 юрыстаў), можа асвоіць прафесію муляра, печніка, сталяра, аддзелачніка, газаэлектразваршчыка. Увогуле ж беспрацоўныя праходзяць у горадзе навучэнне (сярэдняя працягласць — 4,5 месяца) па 35 спецыяльнасцях. Пытанне толькі ў тым, каб тыя ж будаўнікі засталіся працаваць у нас, а не з'ехалі, па прыкладу многіх сваіх калег са стажам, па больш высокі заробак у Расію ці Польшчу. Але тут ужо не абысціся без фінансавых стымулаў.

Літаральна нарасхват, як кажуць, у Гродне і слесары — па кантролі вымяральных прыбораў і аўтаматыкі, рамонце абсталявання, інструментальшчыкі, сантэхнікі і г.д. (больш за 100 вакансій з зарплатай 220—800 тыс. руб.), а таксама па рамонце аўтамабіляў (29 чалавек, зарплата 250 — 900 тыс. руб.). Патрабуецца таксама шмат станочнікаў дрэваапрацоўкі (350 — 900 тыс. руб.), токараў (350 — 600 тыс. руб.), сталяроў (да 600 тыс. руб.), фрэзероўшчыкаў (350 — 800 тыс. руб.), электраманцёраў (400—700 тыс. руб.), электразваршчыкаў (400—800 тыс. руб.), аператараў рознага профілю (да 700 тыс. руб.), машыністаў экскаватараў і кранаў (300 тыс.—1,2 млн руб.). Наладчыку абсталявання абяцаюць зарплату 320 —700 тыс. руб. (станкоў і маніпулятараў з праграмным кіраваннем — 1 млн руб.), цесляру 500—800 тыс. руб., дарожнаму рабочаму — 600—700 тыс. руб., трактарысту — 260—700 тыс. руб., спецыялісту па рамонце абутку — 500 тыс. рублёў.

Вялікі попыт у абласным цэнтры і на шафёраў. Да прыкладу, аўтобуснаму парку № 1 патрабуецца ажно 60 вадзіцеляў (зарплата — 1 млн 150 тыс. руб.), а ДАП-2 запрашае 5 «дальнабойшчыкаў» (1,5 млн руб., новы аўтамабіль MAN). Ёсць і яшчэ 56 вакансій вадзіцеля на розных прадпрыемствах з заробкам да 800 тыс. рублёў.

Адразу ж звяртаеш увагу, што ў асноўным вышэйпамянёныя заяўкі датычацца мужчын. А па якіх жа спецыяльнасцях прапануюць работу жанчынам? Без праблем можна ўладкавацца швачкай (112 вакансій) з зарплатай 300—500 тысяч рублёў. Прыкладна на такім жа ўзроўні і зарплата прадаўцоў харчовых тавараў (31 вакансія) пры сярэдняй па вобласці каля 720 тысяч рублёў. Пэўна, па гэтай прычыне многія гандлёвыя работнікі, якія пазбавіліся працы ў індывідуальных прадпрымальнікаў, так і не вырашылі кадравую праблему многіх гарадскіх магазінаў. Увогуле ж у сувязі з пераходам ІП у прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы па вобласці ў органы занятасці звярнуліся, згодна з апошняй інфармацыяй, 814 чалавек. З іх 207 ужо працаўладкаваны, 62 — накіраваны на прафесійнае навучанне, 30 — звярнуліся па фінансавую субсідыю для арганізацыі сваёй справы.

Але вернемся да спецыяльнасцяў, якія прынята лічыць жаночымі. У горадзе ёсць, у прыватнасці, вакансіі кладаўшчыка (350—750 тыс. руб.), кантралёра пасажырскага транспарту (500 тыс. руб.), цырульніка (400—500 тыс. руб.), кандытара (300—540 тыс. руб.), повара (180—450 тыс. руб.), закройшчыка-мадэльера (500 тыс. руб.), майстра па манікюры (400 тыс. руб.). А найбольш, 25 — гэта вакансіі медсястры з заробкам 215—400 тыс. руб. На ўборцы вытворчых памяшканняў можна зарабіць да 220 тыс. руб., гардэробшчыкам — 200—250 тыс. руб. Пры ўсёй павазе да гэтай працы неяк дзіўна, што вакантнае рабочае месца бібліятэкара «каштуе» 213 тыс. руб. у месяц, педагога-арганізатара ў школе — 250 тыс. руб. Альбо хто пойдзе за 250 тысяч рублёў выкладаць дысцыпліны электратэхнічнага цыкла ў каледж? Дзе знайсці акцёра ў тэатр лялек, чыя творчасць ацэньваецца ў 290 тыс. руб.? Бо трэба ж купляць прадукты, плаціць за жыллё…

А цяпер успомнім Аркадзя Райкіна з яго поглядам на таваразнаўцаў і інжынераў. Таваразнаўцаў, мяркуючы толькі па дзвюх вакансіях (500 і 800 тыс. руб.), і сёння хапае. А вось з інжынерамі (найбольшая зарплата ў праграмістаў — 850 тыс.—1 млн руб.) — праблема. У Гродне больш за сто вакансій інжынераў у самых розных сферах дзейнасці — у будаўніцтве, праектных арганізацыях, на прадпрыемствах.

Дарэчы, нягледзячы на цяжкасці з працаўладкаваннем бухгалтараў, у гарадской службе занятасці ёсць заяўкі і на радавых бухгалтараў, намеснікаў галоўнага бухгалтара (да 675 тыс. руб.), і на галоўных бухгалтараў (да 1,2 млн руб.). Як правіла, наймальнікам патрэбны спецыялісты з трох—пяцігадовым стажам. Але як жа, не працуючы, набрацца вопыту?

І, нарэшце, начальнікі. Аказваецца, і тут не без праблем. Патрабуюцца начальнікі ўпраўлення, станцыі, цэха, участка, аддзела, сектара, бюро (600 тыс.—1,5 млн. руб.). Ёсць таксама вакансіі галоўнага інжынера (550 тыс.—1,6 млн руб.), галоўнага канструктара (1,5 млн руб.), галоўнага архітэктара ў праектным інстытуце (1,4 млн руб.), галоўнага архітэктара праекта (1,2 млн руб.).

Усе вышэйпамянёныя лічбы, мажліва, будуць павялічаны тымі ці іншымі надбаўкамі. У шэрагу выпадкаў улічваецца не толькі стаж прэтэндэнта на рабочае месца, але і ўзрост, веданне камп'ютара, наяўнасць кваліфікацыйнага пасведчання і іншых дакументаў. У адной з заявак нават ад начальніка аддзела забеспячэнне з зарплатай ажно 223 тысячы рублёў патрабуецца вопыт у гэтай дзейнасці. А, напрыклад, інжынеру — тэхнічнаму кансультанту з вышэйшай адукацыяй трэба быць не толькі ініцыятыўным, камунікабельным, але і мець добрую дыкцыю і рэспектабельны знешні выгляд.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Аляксандр ЖУК: **Прыёмная кампанія-2008**

«ПРАФАДБОР: НА НАВУКОВАЙ АСНОВЕ І З УДЗЕЛАМ ЗАКАЗЧЫКАЎ»

«Правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, зацверджаныя ўказам кіраўніка нашай дзяржавы два гады таму, выканалі асноўную сваю задачу — забяспечылі справядлівы і празрысты конкурсны адбор прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. І тыя змяненні і дапаўненні, што былі ўнесены ў Правілы прыёму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 8 лютага 2008 года № 70, не носяць прынцыповага характару», — такую думку выказаў на сустрэчы з журналістамі першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр Жук.

Паводле слоў Аляксандра Жука, усе асноўныя механізмы конкурснага адбору, якія прайшлі праверку часам, былі захаваныя. Асноўнай формай правядзення ўступных выпрабаванняў застанецца цэнтралізаванае тэсціраванне. Больш за тое, з гэтага года ВНУ ўжо не змогуць арганізоўваць свае іспыты па тых дысцыплінах, па якіх у краіне праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне. Гэтым правам карысталіся класічныя факультэты некаторых універсітэтаў і недзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Выключэнне было зроблена толькі для тых спецыяльнасцяў, пры паступленні на якія абітурыенты здаюць рускую ці беларускую літаратуру, творчасць і фізічную культуру. Такім чынам, у абітурыентаў на руках павінна быць тры сертыфікаты цэнтралізаванага тэсціравання. Захаваліся таксама сярэдні бал атэстата і асобныя конкурсы для абітурыентаў-гараджан і абітурыентаў з сельскай мясцовасці.

— Аднак з улікам прапаноў Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам і правядзеннем уступных іспытаў было вырашана адкарэктаваць некаторыя пазіцыі, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Так, было прынята рашэнне скараціць тэрміны правядзення прыёмнай кампаніі ў ВНУ на адзін тыдзень, тым больш што залічэнне цяпер адбываецца пераважна на падставе заяўленых абітурыентамі сертыфікатаў. Калі мы ў папярэднія гады завяршалі залічэнне абітурыентаў у ВНУ 11 жніўня, то цяпер прыёмная кампанія будзе завяршацца там 4 жніўня. Адпаведна пасунуцца і тэрміны прыёмнай кампаніі ў ССНУ.

Яшчэ адзін важны нюанс: падчас будучай прыёмнай кампаніі будуць дзейнічаць аднолькавыя ўмовы для абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе на бюджэтную і платную форму навучання. Раней дазвалялася пераносіць дакументы з адной спецыяльнасці на іншую толькі калі ты ўдзельнічаў у конкурсе на бюджэтнае навучанне. А тыя, хто адразу збіраўся навучацца платна, такога права былі пазбаўленыя. Больш такой дыскрымінацыі не будзе.

За ўдзел у цэнтралізаваным тэсціраванні цяпер давядзецца плаціць — на афіцыйнай мове гэта называецца рэгістрацыйным узносам. Памер і парадак яго ўнясення будуць вызначацца Ўрадам Рэспублікі Беларусь. Плануецца, што памер платы складзе 10 тысяч рублёў за адзін тэст (адпаведны дакумент зараз знаходзіцца ў Савеце Міністраў) і адпаведна 30 тысяч — за тры тэст-экзамены. У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што гэта мера спыніць паток, так бы мовіць, выпадковых людзей, якія рэгіструюцца, але не прыходзяць на цэнтралізаванае тэсціраванне, ці хоць бы часткова кампенсуе выдаткі на друкаванне тэставых матэрыялаў, рэзервавanне ва ўстановах адукацыі пасадачных месцаў і г.д. Летась, дарэчы, набралася на ўсіх прадметах 40 тысяч чалавек, якія зарэгістраваліся, але праігнаравалі тэст-экзамен. Рэгістрацыя для ўдзелу ў ЦТ будзе праходзіць з 2 мая па 1 чэрвеня. У бок павелічэння была прагледжана ніжняя мяжа тэставага бала, пачынаючы з якой вынік ЦТ прызнаецца адпаведным станоўчай адзнацы і дазваляе ўдзельнічаць у конкурсе. Падчас апошняй прыёмнай кампаніі прахаднымі былі 15 тэставых балаў, і некаторыя скептыкі сцвярджалі, што для атрымання 15 балаў дастаткова проста ўгадаць пэўную колькасць правільных адказаў. Цяпер жа, каб удзельнічаць у конкурсным адборы, трэба будзе атрымаць не менш як 20 тэставых балаў.

Быў удасканалены таксама парадак пазаконкурснага залічэння абітурыентаў, каб больш не дапускаць сітуацый, калі абітурыенты з больш нізкімі баламі ў сертыфікатах не прапускаюць у ВНУ добра падрыхтаваных абітурыентаў. Летась, напрыклад, у Міжнародным экалагічным універсітэце імя А.Д. Сахарава на спецыяльнасці «медыцынская экалогія» на 25 бюджэтных месцаў было пададзена 29 заяў ад абітурыентаў, якія мелі права на залічэнне па-за конкурсам. Пры гэтым астатнія 97 абітурыентаў, якія не карысталіся льготамі, не змаглі нават паўдзельнічаць у конкурсе. Такім чынам, права на пазаконкурснае залічэнне было вырашана захаваць толькі за дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без бацькоўскай апекі.

— Гэта менавіта тая катэгорыя абітурыентаў, якой асабліва патрабуецца дзяржаўная сацыяльная падтрымка, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Астатнія ж, хто мог раней прэтэндаваць на пазаконкурснае залічэнне, будуць мець цяпер толькі прыярытэтнае права на залічэнне, калі набяруць аднолькавую колькасць балаў са сваімі асноўнымі канкурэнтамі. Аднак, хачу звярнуць увагу, што дзецям-інвалідам і інвалідам I і II груп будзе дадзена права ўдзельнічаць у конкурсе на завочную бюджэтную форму навучання, не маючы практычнага вопыту работы па абранай спецыяльнасці. Зразумела, пры адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў. Справа ў тым, што многія з такіх дзяцей па прычыне фізічных абмежаванняў проста не могуць працаўладкавацца, каб займець неабходны для паступлення стаж работы. Цяпер гэта акалічнасць больш не будзе для іх перашкодай…

Таксама права на пазаконкурснае залічэнне захавалася за пераможцамі і прызёрамі афіцыйных чэмпіянатаў, розыгрышаў кубкаў Рэспублікі Беларусь і іншых афіцыйных спаборніцтваў пры паступленні на спецыяльнасці фізічнай культуры і спорту.

Паколькі ахвотнікаў атрымаць другую вышэйшую адукацыю становіцца ў Беларусі з кожным годам усё больш, прычым іх колькасць нярэдка перавышае колькасць адведзеных месцаў, даўно наспела неабходнасць устанавіць для іх больш падрабязныя крытэрыі конкурснага адбору. Так, у першую чаргу, «вагу» будзе мець дыплом аб першай вышэйшай адукацыі з адзнакай. Далей перавага будзе аддавацца асобам з больш працяглым стажам работы. Затым — асобам, указаным у артыкуле 18 Закона «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС», артыкулах 19, 20, 23—25 гэтага ж закона і звольненым у запас ваеннаслужачым (у прывядзеным парадку).

Больш лібералынымі сталі ўмовы адбору абітурыентаў для навучання на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі па спецыяльнасцях сельскагаспадарчага профілю. Калі раней яны павінны былі не толькі жыць у сельскай мясцовасці не менш як два гады да паступлення, але і вучыцца ў сельскай навучальнай установе, то цяпер засталося толькі патрабаванне наконт іх пражывання ў вёсцы.

— У сувязі з рэарганізацыяй у сельскай мясцовасці сеткі навучальных устаноў многія школьнікі атрымліваюць сёння адукацыю ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, — патлумачыў Аляксандр Жук, — але застаюцца пры гэтым вясковымі жыхарамі, таксама як і выпускнікі гарадскіх прафтэхустаноў. Але ж сельскай гаспадаркі вельмі патрэбныя кваліфікаваныя спецыялісты…Таму і было прынята рашэнне падтрымаць вясковую моладзь. Акрамя таго, у дакументе аб адукацыі па прадметах уступных іспытаў у іх павінны быць адзнакі не ніжэй як 5 балаў (раней было 6 балаў). Як бачна, планка патрабаванняў для іх знізілася. А для іншых мэтавікоў, якія будуць паступаць на спецыяльнасці лесагаспадарчага, медыцынскага, педагагічнага профіляў, а таксама на спецыяльнасці журналістыкі, культуры і творчасці захавалася ранейшае патрабаванне — не менш як 6 балаў па профільных прадметах уступных іспытаў.

А цяпер колькі слоў аб самым неадназначным пункце, які з'явіўся ў правілах прыёму. Для абітурыентаў, якія будуць паступаць на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «праваznаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка» і «мытная справа» будзе праводзіцца папярэдняя прафесійна-псіхалагічная гутарка ці тэсціраванне.

— У прафесійным тэсціраванні няма нічога новага, паколькі асабліявыя патрабаванні ўжо даўно прад'яўляюцца да абітурыентаў, якія паступаюць у навучальныя ўстановы міністэрстваў абароны, ўнутраных спраў і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, — падзяліўся сваім бачаннем сітуацыі Аляксандр Жук. — Хачу звярнуць увагу, што на пералічаных вышэй спецыяльнасцях рыхтуюцца спецыялісты, якія будуць прадстаўляць нашу краіну на міжнароднай арэне, абараняць інтарэсы грамадзян у судах, працаваць у сродках масавай інфармацыі. На сустрэчы са студэнтамі журфака Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка падкрэсліў, што сродкі масавай інфармацыі — гэта найбольш магутная зброя, а журналістыка — гэта вялікая адказнасць перад грамадствам.

Прызнаюся, што мы разглядалі розныя варыянты, напрыклад, накавалася, што рэкамендацыю для паступлення на гэтыя спецыяльнасці будуць даваць установы адукацыі і раённыя органы ўлады, але ў выніку мы спыніліся на тэсціраванні, якое будзе праводзіцца непасрэдна ў ВНУ спецыяльнымі камісіямі, куды ўвойдуць выкладчыкі факультэтаў і непасрэдныя заказчыкі кадраў — прадстаўнікі міністэрстваў інфармацыі, юстыцыі і мытнага камітэта. На нашу думку, у ВНУ працуюць сапраўдныя прафесіяналы, якія змогуць правесці прафесійны адбор на навуковай аснове, з улікам свайго вопыту ў падрыхтоўцы кадраў. Ніхто лепш за іх з гэтай задачай не зможа справіцца.

Хачу звярнуць увагу на тую акалічнасць, што прафесійнае тэсціраванне будзе праходзіць яшчэ да пачатку рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне. Такім чынам у абітурыентаў, якім па нейкай прычыне на прафадборы не пашанцуе, будзе магчымасць і час, каб пераарыентавацца ў выбары прафесіі і, адпаведна, у выбары дысцыплін для здачы на цэнтралізаваным тэсціраванні. А, з іншага боку, на той момант усе верагодныя прэтэндэнты будуць знаходзіцца ў роўных умовах, і невядома, хто з іх і з якім вынікам здасць у чэрвені цэнтралізаваныя тэсты.

І напрыканцы яшчэ адна істотная заўвага — для таго, каб прайсці прафесійна-псіхалагічнае тэсціраванне, скажам, школьніку з Брэста, які плануе паступаць на «правазнаўства» ў сталічную ВНУ, зусім неабавязкова будзе ехаць у сталіцу. Ён зможа зрабіць гэта і ў сваім абласным цэнтры. Аналагічны прынцып рэалізуецца і пры здачы цэнтралізаванага тэсціравання. Да таго ж трэба мець на ўвазе, што праходзіць прафесійна-псіхалагічнае тэсціраванне пры паступленні на «правазнаўства» давядзецца ў тым ліку і абітурыентам недзяржаўных ВНУ. Больш падрабязную інфармацыю можна будзе атрымаць у той ВНУ, «штурм» якой запланаваны на будучае лета. У бліжэйшыя дні Міністэрства адукацыі абяцае азнаёміць широкую грамадскасць з механізмам і парадкам правядзення прафесійна-псіхалагічнага тэсціравання. Адпаведны дакумент знаходзіцца цяпер у завяршальнай стадыі.

На пытанне журналіста «Звязды», ці мае намер Міністэрства адукацыі пашыраць практыку правядзення прафесійна-псіхалагічнага тэсціравання і па іншых спецыяльнасцях, напрыклад, па медыцынскіх і педагагічных, Аляксандр Жук паведаміў наступнае: «Калі жыццё будзе падказваць, што ў гэтым ёсць неабходнасць, такая магчымасць не выключаецца. Мы будзем праводзіць неабходную работу сумесна з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі»…

Надзея НІКАЛАЕВА.

Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

проводит открытый аукцион по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства: **Лот 1** — земельный участок в деревне Раков, площадь участка — 0,1875 га, начальная цена 18 750 000 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок в д. Раков, площадь участка 0,1459 га, начальная цена 14 590 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости газ. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3604000000349 в фили

ЦЭНЫ НА АПТЭЧНЫХ ВАГАХ

Мінсельгасхарч прапануе паэтапнае павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю

Беларусь застаецца, бадай, адзінай краінай у СНД, дзе цэны на асноўныя прадукты харчавання заўсёды суадносяцца з сярэднімі даходамі насельніцтва, і павышэнне цэнаў ідзе не абвальным шляхам, а паэтапна, з адначасовым павелічэннем пенсій, дапамог і заработнай платы. У гэтым і заключаецца асноўны прынцып сацыяльна арыентаванай эканомікі Беларусі. Менавіта па гэтай прычыне ўрад краіны і Мінэканомікі пакуль стрымліваюць рост цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю, хоць сельгасвытворцы даўно ўжо маюць аб'ектыўныя прычыны для іх павышэння.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання падрыхтавала прапановы аб павышэнні закупачных цэнаў, аргументуючы неабходнасць гэтага ў першым квартале гэтага года. Як паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі галіновага міністэрства Ганна Андрыевіч, затраты на вытворчасць прадукцыі ў 2007 годзе выраслі на Br1,3 трлн, або на 16 працэнтаў, у тым ліку прадукцыі раслінаводства, дзе больш за ўсё праявілася павышэнне цэнаў на энарганосьбіты, — на 19,7 працэнта, жывёлагадоўлі — на 13,5 працэнта. На павышэнне сабекошту прадукцыі паўплывала падаражанне нафтапрадуктаў (на Br450 млрд), мінеральных угнаенняў (на Br150 млрд), газу, электра- і цеплаэнергіі (на 100 млрд).

Паводле слоў Ганны Андрыевіч, выйсце з існуючай сітуацыі, безумоўна, знайсці можна. Адзін з самых правільных і простых — узняць закупачныя цэны да ўзроўню цэнаў у сумежных рэгіёнах суседніх дзяржаў, дзе яны вышэйшыя як мінімум у 2 разы. На яе думку, мэтазгодна павысіць закупачныя і гранічныя адпускныя цэны па выніках першага квартала, калі ўжо будуць вядомыя першыя вынікі работы галіны ў гэтым годзе. Але і цягнуць з павышэннем цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю нельга, лічыць спецыяліст.

Большасць малочных перапрацоўчых прадпрыемстваў завяршылі 2007 год з прыбыткам, але толькі дзякуючы таму, што ім стала больш выгадна рэалізаваць малочную прадукцыю на экспарт. Напрыклад, калі ў 2006 годзе сметанковае масла прадавалі ў сярэднім па $1,9 за 1 кг, то ў снежні 2007 года — па $4,3 за 1 кг, сухое абястлушчанае малако — адпаведна па $1,8 і $4,4, цвёрдыя сыры — па $2,6 і $5,7. Так выгадна складвалася кан'юнктура цэнаў на знешнім рынку для беларускіх таваравытворцаў упершыню. Раней экспарт сметанковага масла, як і яго вытворчасць, прыносіў прадпрыемствам толькі страты. На думку Ганны Андрыевіч, калі цяпер не павысіць цэны на жывёлагадоўчую прадукцыю, можа ўзнікнуць стыхійны вываз прадукцыі ў прыгранічныя расійскія рэгіёны, што паўплывае на забеспячэнне ўнутранага рынку. Хоць Мінгандаль пакуль кіруе сітуацыяй і па-ранейшаму патрабуе ад кожнага магазіна не менш як 20 назваў абавязковага пераліку асартыменту сацыяльна значнай прадукцыі.

У Мінсельгасхарчы прапрацоўваюць некалькі варыянтаў павышэння цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю. У сярэднім закупачныя цэны на малако прапануецца павялічыць на 25—30 працэнтаў, ялавічыну — на 10 працэнтаў, свініну — на 7—10 працэнтаў. Калі гэта адбудзецца, то адпускныя цэны на малако, смятану, кефір і тварог могуць вырасці на 25 працэнтаў, сметанковае масла — на 47 працэнтаў, сыры і мяса — на 16 працэнтаў, мясапрадукты — на 14 працэнтаў. Цэны на мяса птушкі Мінсельгасхарч рэгулюе самастойна, узгадняючы іх з Мінэканомікі. Але асноўнае рашэнне застаецца за ўрадам.

Паводле даных статыстыкі, за апошні год цэны на асноўныя прадукты харчавання ў Беларусі павялічыліся на 15,9 працэнта, а ў снежні ў параўнанні з лістападам — на 2,8 працэнта. Больш за ўсё ў нашай краіне падаражэлі малако і малочныя прадукты — на 28 працэнтаў. За год цэны на крупы і бабовыя выраслі на 14 працэнтаў, у тым ліку на манныя крупы — на 17 працэнтаў, прасяныя — на 30 працэнтаў, гарох, фасолю — на 31 працэнт. Хлеб і хлебабулачныя вырабы падаражэлі на 11 працэнтаў, яйкі — на 12 працэнтаў, ялавічына, свініна, каўбасныя вырабы і вэнджаніна, мяса птушкі, макаронныя вырабы — на 14—18 працэнтаў, маргарын, маянэз, масла сметанковае, сыры — на 21—24 працэнты, алей — у 1,7 раза. Рост цэнаў за месяц не такі высокі. Напрыклад, цэны на мяса і мясапрадукты ў снежні 2007 года ў параўнанні з лістападам павялічыліся ўсяго на 4,2 працэнта, малако і малочныя прадукты — на 1,5 працэнта, у тым ліку цвёрды сыр — на 6,6 працэнта, сметанковае масла — на 6,7 працэнта. Яйкі сталі даражэйшыя на 1,3 працэнта, алей — на 0,7 працэнта. Хлеб і хлебабулачныя вырабы, пшанічная мука выраслі ў цане на 0,7 працэнта, макаронныя вырабы — на 0,6 працэнта. Крупы і бабовыя, кандытарскія вырабы падаражэлі на 1,8 працэнта.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Эдмінас БАГДОНАС:

«Зніжэнне кошту візаў у Шэнген — праз дыялог з Бруселем»

Пасля далучэння Літвы да шэнгенскай прасторы консульскі аддзел пасольства Літвы ў Мінску выдаў каля 3 тыс. шэнгенскіх візаў. Каля 30 працэнтаў візаў былі бясплатнымі. Аб гэтым заявіў учора ў Мінску на прэс-канферэнцыі пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас.

Пасол дадаў, што сёння дзве краіны вядуць працу над падпісаннем пагаднення аб перамяшчэнні прыгранічнага насельніцтва. Жыхары памежных тэрыторый змогуць атрымаць пасведчанні тэрмінам на 5 гадоў з правам наведваць тэрыторыі суседніх краін на адлегласці да 50 кіламетраў. Паводле папярэдніх падлікаў, права на пасведчанні будуць мець каля 200 тыс. чалавек.

Што датычыцца магчымасці зніжэння кошту шэнгенскіх візаў, то, паводле слоў пасла, для гэтага «неабходны дыялог паміж Беларуссю і Бруселем». Аднак пакуль «такога дыялогу не атрымалася». Гаворачы пра эканамічнае супрацоўніцтва краін, пасол адзначыў, што летась таварааварот павялічыўся на 36 працэнтаў. Актыўна развіваецца супрацоўніцтва па выкарыстанні Беларуссю магутнасцяў Клайпедскага порта. «Сёння магутнасці порта загружаны больш чым на 20 працэнтаў беларускімі грузамі». У той жа час, паводле слоў Эдмінаса Багдонаса, існуюць праблемы з прыходам літоўскага капіталу ў Беларусь. Галоўная прычына ў вялікай колькасці «бюракратычных перашкод». У той жа час, калі б праблемы інвестараў былі вырашаны, то ў эканоміку краіны, паводле ацэнкі пасла, магло б паступіць 2—3 млрд долараў ЗША.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ ПІСАЦЬ ЗАЯВЫ НА... ЗВАЛЬНЕННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Варта памятаць, што спачатку факт парушэння наймальнікам умоў кантракта павінен вызначыць адзін з трох спецыяльна ўпаўнаважаных органаў — дзяржаўная інспекцыя працы, прафсаюзы або суд, — кажа Ірына Шыляева. — І толькі пасля ўстанаўлення такога факта ў работніка з'яўляецца магчымасць датэрміновага скасавання працоўных адносінаў. Прычым, калі работнік не з'яўляецца пенсіянерам, падчас звальнення ён зможа запатрабаваць выплаты выхадной дапамогі ў памеры свайго 3-месячнага сярэдняга заробку.

Тым часам ці магчыма тут пайсці больш «лёгкім» шляхам — напісаць заяву, паведаміць у ёй прычыны свайго рашэння, а потым... проста не выходзіць на работу?

— Такі шлях непрымальны, — працягвае Ірына Шыляева. — Нягледзячы на заяву, да з'яўлення загада аб звальненні выходзіць на работу і выконваць правілы ўнутранага працоўнага распарадку трэба, бо інакш ёсць рызыка патрапіць у вельмі непрыемную сітуацыю — вас звольняць за прагулы.

Хто асноўны і часовы?

Зноў-такі цікавая сітуацыя. Жанчына, што знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, вырашае раней вярнуцца на работу. Але тут высвятляецца: на яе месца прыняты новы чалавек. Што будзе ў такой сітуацыі?

— Жанчына, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, мае права вярнуцца на сваё месца ў любы момант, бо яна лічыцца работнікам асноўным, тады як чалавек «на замене» — работнікам часовым, — тлумачыць Ірына Шыляева. — І па жаданні наймальніка ні перавод на іншую пасаду, ні звальненне асноўнага работніка немагчымыя — такія варыянты верагодныя толькі на падставе пісьмовай заявы самой «дэкрэтніцы».

5 дзён на афармленне

У дзень звальнення наймальнік абавязаны не толькі правесці канчатковы разлік, але і выдаць на рукі працоўную кніжку — у адваротным выпадку работнік зможа патрабаваць выплаты свайго сярэдняга заробку за кожны дзень пратэрміноўкі. Аднак што рабіць, калі акажацца, што працоўнай кніжкі няма і яе... нават не заводзілі?

— Калі чалавек раней не працаваў, то выпісаць працоўную кніжку яму павінны не пазней чым праз 5 дзён пасля ўладкавання, — распавядае Ірына Шыляева. — Прычым гэта патрабаванне заканадаўства датычыцца арганізацый усіх формаў уласнасці.

Санкцыі — не толькі водпуск

Заканадаўства вызначае, што тэрмін працоўнага водпуску можа змяншацца на колькасць дзён прагулу без уважлівых прычын. Правіла вядомае. Але тут таксама ўзнікаюць пытанні. Арганізацыя з'яўляецца стратнай, ніякіх «прыбавак» за стаж ці ненармаваную работу тут не даюць, усе работнікі маюць толькі 24 гарантаваныя заканадаўствам дні. Як у такім разе можна пакараць парушальніка працоўнай дысцыпліны?

— «Мінусаваць» прагулы з 24 дзён мінімальнага водпуску нельга, — зазначае Ірына Шыляева. — Аднак сцвярджаць, што тыя ж прагульшчыкі зараз застануцца беспакаранымі, таксама нельга, бо існуюць і іншыя «меры ўздзеяння» — ад пазбаўлення тых ці іншых выплат да звальнення.

Усё вырашае атэстацыя

Калі дадатковы водпуск за стаж і ненармаваную работу прадстаўляюцца за кошт уласных сродкаў наймальніка, то «лішнія» дні адпачынку за шкодныя ўмовы ад прыбытку ўжо не залежаць. Праўда, простага ўключэння прафесій у спецыяльныя пералікі яшчэ недастаткова. Шкодныя, небяспечныя ці асаблівыя ўмовы павінны пацвярджацца атэстацыяй працоўных месцаў, прычым атэстацыя павінна прайсці на працягу гэтага года і да таго ж — ва ўсіх арганізацыях.

Калі «забылі» разлічыцца...

Паводле дагавора падраду брыгада выканала рэканструкцыю жывёлагадоўчай фермы. Аднак пасля заканчэння работ заказчык стаў адмаўляцца выплаціць абяцаныя грошы. Грамадзянска-прававыя дагаворы не рэгулююцца працоўным заканадаўствам, адпаведна, адстаяць свае правы брыгада зможа толькі ў судзе.

Іншая справа — затрымкі разлікаў з работнікамі, якія занятыя па працоўных дагаворах. Тут для абароны інтарэсаў можна звяртацца як у суд, так і ў дзяржаўную інспекцыю працы.

— Выплата заробкаў павінна рабіцца ў дні, якія пазначаны ў калектыўных дагаворах, працоўных дагаворах ці ў кантрактах, — адзначае Ірына Шыляева. — І, да слова, змяшчэнне гэтых тэрмінаў лічыцца парушэннем заканадаўства, якое вядзе да накладання на штрафу ад 4 да 20 базавых велічынь на канкрэтнага службоўца і да 100 базавых велічынь — на юрыдычную асобу.

Сяргей ГРЫБ.
Талачынскі раён.

ЧЭКАВАЯ ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ — ДА ЛІПЕНЯ?

У Мінску на 1 кастрычніка 2007 года імянныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасць» атрымалі 775 тыс. чалавек, паведаміў БЕЛТА дырэктар Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага фонду дзяржмаёмасці Андрэй Такарчук. Выкарысталі чэкі 382 тыс. чалавек, або 49 працэнтаў агульнай колькасці іх уладальнікаў.

Цяпер у Мінску выстаўлены для абмену на чэкі «Маёмасць» 551 аб'ект. Чэкавая прыватызацыя прадоўжана да ліпеня 2008 года, пасля чаго Савет Міністраў павінен прыняць рашэнне аб яе прадаўжэнні або заканчэнні, дадаў Андрэй Такарчук.

Кар. БЕЛТА.

Захоўваецца тэндэнцыя павелічэння нараджэння другога і трэцяга дзяцей

Калі ў 2006 годзе доля дзяцей, народжаных першымі, складала 57,4 працэнта, другімі — 31,9 працэнта і трэцімі — 7,5 працэнта, то ў 2007 годзе — адпаведна 55,5 працэнта, 33,2 працэнта і 8,1 працэнта. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.

У 2007 годзе ў рэспубліцы нарадзіліся 103,4 тыс. чалавек, памерлі 132,9 тыс. чалавек, прыбылі ў рэспубліку 14,2 тыс., выбылі 9,5 тыс. чалавек. У параўнанні з 2006 годам колькасць народжаных павялічылася на 6,7 тыс. чалавек, або на 6,9 працэнта; колькасць памерлых ва ўсіх узроставых групах скарацілася на 5,6 тыс. чалавек, або на 4 працэнты (у тым ліку ў працаздольным узросце — на 6,3 працэнта). Міграцыйны прырост за 2007 год у параўнанні з 2006 годам скараціўся на 16,9 працэнта і склаў 4,7 тыс. чалавек супраць 5,6 тыс. чалавек у 2006 годзе.

У мінулым годзе ўзрос узровень нараджальнасці — ён склаў 10,7 народжаных на 1000 насельніцтва супраць 9,9 народжаных у 2006 годзе. У гарадах і гарадскіх паселішчах агульны каэфіцыент нараджальнасці павялічыўся да 10,8 чалавека на 1000 насельніцтва, у сельскай мясцовасці — да 10,1. Паказчыкі нараджальнасці павысіліся ва ўсіх абласцях.

Паводле папярэдніх даных на 1 студзеня 2008 года, колькасць насельніцтва Беларусі склала 9689,7 тыс. чалавек і ў параўнанні з 1 студзеня 2007 года скарацілася на 24,8 тыс. чалавек. За апошнія тры гады гэта найбольш нізкі паказчык агульнага змяншэння колькасці насельніцтва, падкрэслілі ў міністэрстве. За 2005 год насельніцтва рэспублікі зменшылася на 49,6 тыс. чалавек, за 2006 год — на 36 тыс. чалавек.

Колькасць насельніцтва знізілася ва ўсіх абласцях рэспублікі. Больш за ўсё — у Віцебскай (на 9,8 тыс. чалавек, або на 0,8 працэнта) і Магілёўскай (на 7,9 тыс. чалавек, або на 0,7 працэнта) абласцях. У Мінску колькасць насельніцтва павялічылася на 17,2 тыс. чалавек, або на 1 працэнт, у асноўным за кошт міграцыйнага прыросту (на 14,9 тыс. чалавек) і нязначна за кошт натуральнага прыросту (на 2,3 тыс. чалавек).

Колькасць гарадскога насельніцтва ў цэлым па рэспубліцы склала 7108 тыс. чалавек і павялічылася на 33,2 тыс. чалавек супраць 15,8 тыс. у 2006 годзе. Павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва назіралася ва ўсіх абласцях, акрамя Віцебскай і Магілёўскай.

Колькасць сельскага насельніцтва ў адрозненне ад гарадскога прадаўжае скарачацца. За 2007 год яна зменшылася на 58 тыс. чалавек і на 1 студзеня 2008 года склала 2581,7 тыс. Удзельная вага сельскага насельніцтва ў агульнай колькасці склала 26,6 працэнта супраць 27,2 працэнта на адпаведную дату 2007 года.

Утерянное свидетельство о государственной регистрации № 994 от 9 июля 2002 г. **считать недействительным.**

А на мой погляд...

Экалогія — экалогіяй, але ад поліэтылену без належнай альтэрнатывы наш спажывец пакуль не адмовіцца...

Як паведамілі сродкі масавай інфармацыі, кітайцы з чэрвеня гэтага года збіраюцца забараніць выкарыстанне ў магазінах поліэтыленавых пакетаў (і нават спыніць іх вытворчасць). Прычына? Каб спыніць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Дарэчы, з гэтай жа самай нагоды ў Еўропе і Амерыцы таксама плануюць у 2009—2010 гадах адмовіцца ад выкарыстання поліэтыленавых пакетаў. У якасці альтэрнатывы кітайцы прапаноўваюць выкарыстоўваць тару шматразовага выкарыстання.

А вы гатовы на бытавым узроўні адмовіцца ад выкарыстання такіх пакетаў? Чым, на ваш погляд, іх можна было б замяніць? Ці згодны былі б вы — у мэтах аховы навакольнага асяроддзя — карыстацца нейкай шматразовай тарай?

Вікенцій МОНЦІК, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Ганцавіцкага райвыканкама:

— Калі сапраўды будзе нейкая альтэрнатыва, дык чаму б і не? Але калі не прадумаць гэта пытанне як след, лічу, можа быць яшчэ горш. Альтэрнатыва якая? Папера, кардон. Асноўная ж праблема з поліэтыленавымі пакетамі — складанасці з іх зборам, перапрацоўкай, утылізацыяй. Хоць цяпер мне прыемна зайсці ў магазін — там усе тавары ўжо раскладзены, падрыхтаваны для спажыўца. Памятаеце, калі пакеты толькі з'явіліся, іх бераглі, хавалі *(смяецца)*, выкарыстоўвалі па пяць-шэсць разоў! А потым яны сталі даступнымі, аднаразовымі, адпаведна, імі сталі больш карыстацца і больш выкідваць. Таму нейкая новая ўпакоўка павінна хутка ўтылізацавацца, быць таннай, каб не было шкада яе выкідваць. Раней, памятаеце, у магазіны з «авоськай» хадзілі. Толькі вяртаць яе не трэба, гэта ўжо нейкі анархізм будзе, усё ж культура цяпер іншая.

Аксана САЙКО, эканаміст Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства:

— *(Смяецца.)* Не, я да гэтага не гатовая. Чаму? *(Задумваецца.)* Ды перапрацоўваць іх проста трэба... У Брэсце вось нейкі адпаведны завод працуе, няхай і займаецца гэтай справай. Бо ўзяць тую ж паперу — яна размакае. Якая зручнасць ад такой упакоўкі тады? У Расіі, я чула, нейкі вучоны вынайшаў харчовы поліэтылен. Ён і для прадуктаў, чалавека бясшкодны, і экалагічна чысты, бо, нават трапіўшы ў глебы, на працягу двухтрох гадоў знікае, не наносячы шкоды прыродзе. Але да масавай вытворчасці справа не дайшла, бо гэты працэс аказаўся занадта дарагім. Вось такія альтэрнатыўныя распрацоўкі і трэба ўкараняць, прыкладаць намаганні, каб і тэхналогіі, і самі навінкі былі таннымі.

Віктар БЫКАЎ, галоўны спецыяліст аддзела аналізу і апрацоўкі інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

— Поліэтыленавыя пакеты, я думаю, выкарыстоўвалі, выкарыстоўваюць і будуць выкарыстоўваць надалей. Цалкам ад іх мы, лічу, адмовіцца не зможам. Так, я чытаў пра планы многіх краін адмовіцца ад выкарыстання такіх пакетаў. Асабіста мне, як спажыўцу, і зручна, і больш прыемна браць у магазіне тое ж малако ў кардоннай упакоўцы, а не ў пакеце, які выглядае не так прыгожа. Але далей глядзіце. Набыў пакеты, а куды пакупкі складзі? Правільна, у поліэтыленавы пакет. Трэба, вядома, думаць і пра экалогію, але ў бліжэйшы час ад выкарыстання такой тары мы адмовіцца не зможам.

Ніна КРЭЧЫК, сакратар сельсавета, в. Новадзевяткавічы Слонімскага раёна:

— Лічу, што без іх абысціся не магу. Мяркуйце самі. Штогод мы забіваем трох кабаноў. У маёй маразілцы шэсць скрыняўкантэйнераў для захоўвання харчовых прадуктаў. Дык вось я ўсё мяса, фарш, каўбасы фасую менавіта ў поліэтыленавыя пакеты, падпісваю (дзе што) і замарожваю. Потым ніякіх праблем: з вечара дастала патрэбны пакет, размарозіла і ці катлеты з фаршу зрабіла, ці суп з костачкай зварыла. Як буду захоўваць прадукты без цэлафану? Папера? Дык мяса ж мокрае, усё ў адзін камяк змерзнецца. А ў магазін пайсці — колькі той папяровы пакет вагі вытрымае? Ды і колькі яе выраблялі спатрэбіцца, каб задаволіць усе нашы патрэбы? На агародзе мы карыстаемся поліэтыленавай плёнкай — парнікі ёй накрываем, у пластыку расаду вырошчваем. Не, мы не гатовыя адмовіцца ад поліэтыленавых пакетаў. Хіба толькі вынайдуць нешта такое, што будзе бясшкодным для прыроды, але раўнацэннай заменай для нас, спажыўцоў?.. Паглядзіце, як ходзяць жанчыны. У руках невялікая сумачка, дзе грошы, касметычка, і абавязкова складзены поліэтыленавы пакет. Зайшла ў магазін — ёсць куды пакупкі скласці. А забылася — тут жа табе яго танна і прададуць. Ці будзе жанчына прыгожа выглядаць з нейкай спецыяльнай сумкай для паходаў у магазіны?..

Дыёніс ВІСЛОЦКІ, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Воранаўскага райвыканкама:

— Ведаеце, мы працуем з пенсіянерамі, дык недзе ў аддаленых вёсках тыя самыя «авоські» захаваліся дагэтуль. Але ж гэта ўжо ўчарашні дзень, праўда? Ды і раней, памятаю, па пакупкі з ёй можна было хадзіць у сонечны дзень. А ў дажджлівы ўсе пакупкі магло заліць. Ад поліэтылену, думаю, мы адмовіцца цалкам не зможам, ды і сэнсу такога няма. Колькі вагі вытрымае папяровы — кілаграм? Хоць папера — гэта вельмі добра, і яе трэба больш выкарыстоўваць там, дзе можна. Напрыклад, соль, цукар, іншыя харчовыя тавары трэба фасаваць не ў «хімію», напэўна, не вельмі карысную для нашага здароўя, а ў больш экалагічную паперу.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

«Антыплагіятам» — па нізкай эфектыўнасці!

Сёння сярод сушукальнікаў вучоных ступеняў у нас зніжаецца агульная граматнасць і навуковы кругагляд, матэматычнае забеспячэнне тэхнічных работ часам служыць толькі ў якасці «ўпрыгажэння работы».

Гэта адзначыў учора на сустрэчы з журналістамі старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Анатоль Афанасьеў. Сёння недастаткова вывучаюцца навуковыя праблемы ў галіне інфармацыйных тэхналогій, мікраэлектронікі, энергазберажэння і выкарыстання нетрадыцыйных аднаўляльных крыніц энергіі, якія вызначаюць якасць інавацыйнага развіцця беларускай эканомікі. Як сказаў старшыня ВАКа, эфектыўнасць аспірантуры ў Беларусі сёння не перавышае 10 працэнтаў. Каб павысіць гэты паказчык да запланаваных 70—80 працэнтаў, было прынята рашэнне, што залічваць у аспірантуру цяпер будуць толькі тых, хто скончыў магістратуру і здаў кандыдацкі мінімум па агульнаадукацыйных дысцыплінах. Акрамя таго, ВАК рэкамендавала стварыць пры прафільных арганізацыях (лідарах у сваіх галінах навукі) каардынацыйныя саветы, стварыць профільныя часопісы па прыярытэтных навуковых накірунках. Выданням, уключаным у пералік ВАК для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, рэкамендавана забяспечыць пазачарговую публікацыю навуковых артыкулаў аспірантаў апошняга года навучання.

ВАК плануе стварыць камп'ютарную праграму «Антыплагіят». Мяркуецца, што яна, як бачна з назвы, будзе параўноўваць навуковыя работы сушукальнікаў вучоных ступеняў з ужо існуючымі работамі. Канчатковыя тэрміны стварэння праграмы яшчэ не вызначаны, аднак пэўная частка грошай на гэта з бюджэту ўжо была пералічана. Анатоль Афанасьеў выказаў спадзяванне, што сам факт падрыхтоўкі да стварэння падобнай праграмы павінен павысіць адказнасць сушукальнікаў вучоных ступеняў і іх навуковых кіраўнікоў пры напісанні работ.

Інга МІНДАЛЁВА.

Спорт-тайм

Тэнісісты апусціліся ў рэйтынгу

Мужчынская зборная Беларусі па тэнісе апусцілася з 12-га на 16-е месца ў рэйтынгу Кубка Дэвіса, абноўленага па выніках матчаў, якія прайшлі 8—10 лютага. Беларусь, якая выступае ў новым сезоне ў 1-ай групе Еўра-Афрыканскай зоны, прапускала стартавы тур. Сваю першую сустрэчу каманда Дзмітрыя Татура правядзе 11—13 красавіка ў Мінску з тэнісістамі Швейцарыі, якія, нягледзячы на перамогу над Польшчай, засталіся ў рэйтынгу на 25-ай пазіцыі.

Букмекерскія канторы ставяць на Валуева

Першы канал пакажа ў прамым эфіры баксёрскі паядынак за званне афіцыйнага прэтэндэнта на тытул чэмпіёна свету ў суперцяжкай вазе па версіі WBA паміж беларусам Сяргеем Ляховічам і расіянінам Мікалаем Валуевым. Трансляцыя з нямецкага Нюрнберга пачнецца 16 лютага ў 23.25. Пераможца бою павінен будзе сустрэцца з дзеючым чэмпіёнам Русланам Чагаевым з Узбекістана, які адабраў тытул у Мікалая Валуева вясной мінулага года. Букмекерскія канторы напярэдадні бою аддаюць перавагу расіяніну.

«Дынама» абыграла «Луч-Энергію»

Беларускія клубы, якія знаходзяцца на зборах у турэцкім Белеку, у межах падрыхтоўчых збораў правялі чарговыя кантрольныя матчы. Чэмпіён Беларусі, барысаўскі БАТЭ, памераўся сіламі з серадняком балгарскага чэмпіянату камандай «Черно море» і саступіў 0:1. Мінскае «Дынама» з аналагічным лікам, праўда, на сваю карысць, завяршыла матч з уладзівастоцкім «Лучом-Энергіяй». Адзіны мяч на 11-ай хвіліне забіў славацкі форвард «Дынама» Роберт Рак.

16-гадовы нападаючы ацэнены ў 50 мільёнаў еўра

Шаснаццацігадовы ігрок бразільскага клуба «Сантас» Неймар да Сільва Сантас Джуніёр, якім цікавяцца «Барселона», «Манчэстар Юнайтэд», лонданскі «Арсенал» і мадрыдскі «Рэал», ацэнены сваім клубам у фантастычную суму — 50 мільёнаў еўра. Адпаведны пункт у кантракце нападаючага з'явіўся пасля таго, як кіраўніцтву клуба стала вядома пра інтарэс, які праяўляюць да Неймара еўрапейскія гранды. У іграку, паводле водгукаў спецыялістаў, спалучаюцца хуткасць і тэхніка Рабіньё і кемлівасць наваяўленай зоркі Пато. Сам Неймар называе сваімі футбольнымі кумірамі Пеле, Зідана і Рабіньё.

Па слядах Зідана

Нападаючы «Інтэра» Адрыяна, які знаходзіцца ў арэндзе ў бразільскім «Сан-Паулу», можа атрымаць працяглую дыскваліфікацыю. Падчас матча з «Сантасам» ён ударыў галавой іграка з каманды саперніка. Паводле правілаў, Адрыяна павінен быць дыскваліфікаваны на тры матчы. Аднак калі яго дзеянне будзе расцэнена як «сур'ёзны акт фізічнай агрэсіі», тэрмін дыскваліфікацыі можа скласці ад 120 да 540 дзён, паведамляе «Спорт сёння».

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.



Аўтаадказчык

ЧАСОВАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ — НЕ ПЕРАШКОДА

У мяне ў Мінску толькі часовая рэгістрацыя. Ці магу я паставіць на ўлік у сталіцы нядаўна набыты аўтамабіль?

Марыя ЖЫЛЬСКАЯ.

Як патлумачылі ў сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі, такое права ў вас ёсць. Вы можаце зарэгістраваць свой аўтамабіль у сталіцы.

Увогуле, як падкрэслілі ва ўпраўленні ДАІ ГУСС Мінгарвыканкама, замена прапіскі на рэгістрацыю ніякім чынам не паўплывала на правілы пастаноўкі на ўлік транспартных сродкаў. Не змяніўся і ранейшы парадак зняцця аўтамабіля з уліку. Гэта можна зрабіць толькі ў месцы, дзе зарэгістраваны транспартны сродак.

Аўтабяспека

НЯСПРАЎНЫЯ МАРШРУТКІ

Падчас «прафілактычнай дэкады» супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі выявілі больш за 570 маршрутных таксі з тэхнічнымі няспраўнасцямі, якія рэальна пагражалі бяспецы дарожнага руху.

Такія звесткі паведаміў старшы інспектар упраўлення ДАІ МУС краіны Фёдар Гуліцкі. Паводле яго слоў, за парушэнне Правілаў дарожнага руху да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты больш за 1400 кіроўцаў «маршрутак».

Аўтадаследаванне

СТРАШНЫЯ РАМЯНІ

Брытанская лабараторыя па вывучэнні транспарту і сітуацый на дарогах правяла спецыяльнае даследаванне, каб высветліць, чаму людзі не карыстаюцца рамянямі бяспекі ў аўтамабілях.

Вучоныя прыйшлі да высновы, што многія пасажыры і кіроўцы транспартных сродкаў проста баяцца загінуць менавіта з-за рэмня бяспекі. Большасць удзельнікаў апытання былі перакананы, што падчас аварыі рэмень іх не выратуе, а задушыць. Між іншым, найчасцей ігнаруюць рамяні бяспекі мужчыны. А самыя «злосныя непрышпіленцы» — кіроўцы грузавікоў і таксісты. Гэтых прафесіяналаў апанаваў найбольш моцны страх загінуць ад рэмня бяспекі. Яшчэ спецыялістам удалося высветліць, што многія кіроўцы памылкова лічаць, быццам прышпільвацца неабавязкова, калі іх аўтамабіль абсталяваны падушкай бяспекі. Насамрэч, пры непрышпіленым рамяні падушка бяспекі шматкроць павялічвае рызыку атрымаць траўму.

Дарэчы, памянёная лабараторыя падлічыла, што за 25 гадоў, якія мінулі з моманту абавязковага прымянення рамянёў бяспекі ў Вялікабрытаніі, гэтыя прылады выратавалі ад смерці больш за 60 тысяч чалавек і 670 тысячам дапамаглі пазбегнуць сур'ёзных раненняў.

Аўташыны

ІМГНЕННАЕ «САМАЛЯЧЭННЕ»

Фірма «Continental» стварыла аўтамабільную шыну, якая сама можа сябе «заклеіць». Прычым ліквідацыяй «прабоіны» шына займаецца аўтаматычна. Стваральнікі гэтай навінкі запэўніваюць, што вадзіцель нават не адчуе, калі шына «праколецца». Сакрэт такога «самалячэння» ў тым, што ўнутры шыны знаходзіцца спецыяльны матэрыял, які імгненна рэагуе на «прабоіну» і адразу ж заклейвае яе. У продажы гэтыя «цуда-шыны» з'явяцца ўжо сёлета.

Аўтарэйтынг

ЛЕПШЫЯ ДЫЗЕЛІ

Удзельнікі Паўночнаамерыканскага аўташоў вызначылі 10 лепшых дызельных аўтамабіляў, серыйны выпуск якіх пачнецца ў 2008 годзе.

Адметна, што ўвесь п'едэстал гонару занялі прадстаўнікі нямецкага аўтапрама. На першым месцы ў гэтым рэйтынгу «Audi R8 TDI V12», на другім «баварцы»: «BMW 335D» і «BMW X5 Drive 35D». Далей у дзесятцы лепшых размясціліся наступныя аўто: «KIA Borrego», «Land Rover LRX», «Mercedes-Benc Vision CLK Freeside», «Mitsubishi Concept-RA», «Nissan Forum і Saturn Flextreme», «Subaru Forester».

Аўтахабар

ДАРОЖНАЯ КАРУПЦЫЯ

Сярэдні памер хабару, які летась бралі расійскія «даішнікі», склаў 3,5 тысячы расійскіх рублёў.

Усяго ў мінулым годзе было злоўлена ў момант атрымання хабару 709 супрацоўнікаў Дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху МУС РФ.

Аўтакур'ёз

ПАТАЕМНЫЯ МЕТКІ

Жыхар Обнінска Валер Юнга падаў у суд на інспектара дарожна-патрульнай службы, які, на думку заяўніка, наўмысна пракалоў яго пасведчанне кіроўцы.

Спадар Юнга лічыць, што інспектар зрабіў пракол левага вока на яго фатаздымку ў правах, каб папярэдзіць сваіх калег. Пацярпелы сцвярджае, што расійскія «даішнікі» выпрацавалі цэлую сістэму «пракольных знакаў» у правах. У прыватнасці, прабітае вока азначае, што ўладальнік пасведчання не дае хабар, дзірка ў вушах — юрыдычна падкаваны грамадзянін, праколаты рот — скандаліст. Адметна, што з падобнымі патаемнымі меткамі у сваіх правах сутыкнуліся многія расійскія кіроўцы. Прадстаўнікі Дзяржаўнай інспекцыі бяспекі дарожнага руху назвалі такія абвінавачванні абсурднымі.

Аўтажарт

З грузавіка на легкавы аўтамабіль упала дрэнна замацаванае бервяно. З пашкоджанай машыны выйшла жанчына і расплакалася:

— Муж ніколі не паверыць, што гэта дрэва на мяне наляцела, а не я на дрэва.

РУП «Белспецконтракт» проводит аукцион по продаже автомобильной техники
ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
на 1-ом открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 18 марта 2007 г.

№ п/п	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
1.	Грузовой КамАЗ-43105 ш. 010180, дв. 010598	г. Борисов, в/ч 20193	1986	38 746	16 000 000	1 600 000
2.	Автошасси Урал 375 ш. 109343, дв. 119406	г. Минск, в/ч 63755	1972	3 418	4 500 000	450 000

1-й аукцион состоится в 11.00 18 марта 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПАДУМАЙ І РАШЫ!

Канстанцін Гаўрылаў. Мат за 2 хады. (7+12).



Марыян Урубель. Мат за 2 хады. (10+8).



Аўтар першай задачы — Канстанцін Рыгоравіч Гаўрылаў (1864 — 1943), выдатны рускі праблеміст, заснавальнік айчыннай стратэгічнай дзвюхаходаўкі. Са складзеных ім прыкладна 3 тысяч кампазіцый больш як сто былі прэміяваныя на міжнародных конкурсах. Другая задача была складзена выдатным польскім кампазітарам Марыянам Урубелем (1907 — 1960). На конкурсах ён заваяваў больш як 350 адзнак, у тым ліку каля 80 першых прызоў. Пра Марыяна Урубеля мы пісалі ўжо ў нашых шахматных аддзелах. Чакаем вашых рашэнняў.

ПРАВЕРЦЕ ВАШЫ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні апублікаваных заданняў масавага конкурсу.

№ 13. 1. Лс7! Крd5 2. Кс3+ Крd6 3. Kb5+ Крd5 4. с4х, 1. ... f6 2. Лс6! Крd5 3. Kb4+ Крd4 4. с3х.

№ 14. 1. f4 gf 2. К:f3 Сс7 3. Кd4 і 4. Кс6х. 2. ... Сb6 3. Ке5 І 4. Кс6х; 1. ...Сс7 2. Кс4! Сb6 3. Ке5 і 4. Кс6х, 2. ... Сd6 3. К:а5, 1. ... Сb6 2. Kb3! Сс7 3. Кd4 і 4. Кс6х; 2. ... Сс5 3. К:а5.

КАЗАЧНЫЯ ШАХМАТЫ

У казачных шахматах відазмяняюцца або правілы артадаксальнай гульні, або заданні, а іншым разам і дошка, а, бывае, уводзяцца нават новыя фігуры. Такія абставіны робяць казачныя шахматы крыніцай невычэрпных магчымасцяў. Возьмем, напрыклад, задачы на серыйны (кааператыўны) мат. Іх асаблівасць — стабільнасць пазіцыі белых, прапанаванай аўтарам, да матуючага ходу. Заданне выконваюць чорныя.

Вось задача Ю. Мартынеса. Белыя: Крb1, Фе1 (2), Чорныя: Крe8, Лe7, Лh8 (3). Серыйны кааператыўны мат за 3 хады. У задачы маецца блізня: калі перастаўіць туру з поля h8 на а8. 1. ... 0-0 2. Лh7 3. Лh8 Фg6х. У задачы-блізнюку — 1. ... 0-0-0 2. Лс7 3. Лdd7 І Фа8х.

І яшчэ: задача Е. Барцэля. Белыя: Крe7, Лg6, Се6 (3). Чорныя: Крh8, п h7 (2). Серыйны кааператыўны мат за восем хадоў. 1. ... h5 2. h4 3. h3 4. h2 5. h1K 6. Kg3 7. Kh5 8. Kg7 Лh6х. Тут і пошук крытычнай пазіцыі, і пераўтварэнне пешкі, і тонкае ажыццяўленне задуманага плана пры адзінкавасці рашэння.

ЯК «АБЯЗБОЛІЦЬ» БОЛЬ

36, 6°

Праблема болю і барацьбы з ім здавён прыцягвае шматлікіх даследчыкаў свету. Аднак сутнасць і механізм болю яшчэ канчаткова не раскрытыя. Таму перад медыцынай стаіць важная, пакуль не вырашаная задача — навучыцца кіраваць болевымі адчуваннямі. Невыпадкова з гэтай мэтай створана міжнародная асацыяцыя вывучэння болю. Аб тым, якія метадыкі прымяняюцца сёння, каб «абязболіць» болевае пытанне для пацыентаў, наш карэспандэнт Вольга Шаўко гутарыць з кандыдатам медыцынскіх навук, загадчыцай кафедры псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірынай БАЙКОВАЙ.

— Яшчэ ў старажытнай Грэцыі гаварылі: «Боль — гэта вартавы пёс здароўя». І сапраўды, нягледзячы на тое, што боль амаль заўсёды нясе пакуты, прыгнятае чалавека, знішчае яго працаздольнасць, пазбаўляе сну, ён усё ж неабходны і да вядомых межаў карысны. Пачуццё болю папярэджвае аб небяспецы, быццам гаворыць аб тым, што чалавек павінен быць гатовы да нейкіх змяненняў у арганізме. Але пазітыўную ролю боль адыгрывае толькі да таго часу, пакуль ён засцерагае арганізм ад небяспекі. Як толькі сігнал адзначаны свядомасцю і небяспекі няма, боль становіцца залішнім. Калі ж ён цягнецца доўга, калі балявыя раздражненні працягваюць «бамбардзіраваць» нервовую сістэму, калі чалавек не ў стане пераадолець боль, апошні паступова цалкам завалодвае свядомасцю, расстройвае сон, вельмі многія сістэмы арганізма пачынаюць дзейнічаць разладжана.

Вось на такі неабавязковы боль, які цягнецца звыш неабходнага часу для загойвання, напрыклад, раны ці аднаўлення нейкай функцыі арганізма, мы можам уздзейнічаць з дапамогай псіхатэрапіі.

Існуе яшчэ адзін від болю, на які мы таксама можам уплываць. Гэты боль не звязаны з нейкімі анатамічнымі ці фізіялагічнымі парушэннямі, а абумоўлены выключна псіхалагічнымі механізмамі. Спецыялісты яшчэ называюць яго «боль як сродак выражэння эмацыянальных станаў». Часам гэты боль служыць як бы спосабам дэманстравання агрэсіі, гневу, трывогі, дэпрэсіі і г.д. Нездарма існуе выраз «у мяне баліць сэрца за цябе». Вельмі часта такія эмацыянальныя станы выклікаюць галаўныя болі. Зразумела, у гэтых выпадках псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне выходзіць на першае месца.

Інакш кажучы, мы можам лячыць той боль, які з'яўляецца неабавязковым для арганізма. Гэта можна выкарыстоўваць і пры многіх станах, калі ёсць парушэнні анатамічнай функцыі. Напрыклад, псіхатэрапія прымяняецца пры зубным болі, пры некаторых формах раку, пры болях, звязаных з пэўнымі сасудзістымі праяўленнямі, пры некаторых хваробах пазваночніка.

— Якія фактары перш за ўсё ўлічваюцца пры псіхатэрапеўтычным абязбольванні?

— Міжнародная асацыяцыя па вывучэнні болю рэкамендуе кваліфікаваць боль як востры, які цягнецца менш за шэсць месяцаў, і хранічны — больш за шэсць месяцаў. Як правіла, псіхатэрапеўты маюць справу з хранічным болем. Але ў любым выпадку, перш чым брацца за псіхатэрапію болевых адчуванняў, трэба правесці поўнае медыцынскае даследаванне пацыента. Гэта трэба для таго, каб зразумець, ці не ідзе ў арганізме нейкі нераспазнаны хваравіты працэс. Аднак мы не ўбіраем боль увогуле — як мы гаварылі вышэй, боль усё ж важны сігнал для арганізма — мы вучым канталяваць стан неабавязковага болю.

— Як гэта робіцца?

— Адна з самых асноўных умоў — уменне ўваходзіць у стан расслаблення. Яшчэ лепш, калі гэта будзе стан самагіпнозу ці трансу. Тут многае залежыць ад самастойнай работы пацыента, бо ўрач не можа быць заўсёды побач, калі ўзнікае боль.

Боль можа з'яўляцца выражэннем нейкіх эмацыянальных станаў. Напрыклад, боль як прыцягненне ўвагі да сябе ці як спосаб пазбегнуць нейкіх дзеянняў. Такія матывацыі, як правіла, з'яўляюцца неўсвядомленымі. Мы ж павінны зрабіць іх свядомымі, дабіцца таго, каб пацыент пачаў задаваць сабе пытанні кшталту: чаго я прычапіўся да гэтага болю, для чаго ён мне патрэбны?

Прывяду прыклад. Адна маладая жанчына заўсёды адчувала галаўны боль, калі збіралася наведаць свякроў. Але гэты боль для маладзіцы быў неўсвядомленым. Работа псіхатэрапеўта пайшла ў тым ключы, каб дапамагчы жанчыне ўсвядоміць, што гэтыя непрыемныя для яе візіты могуць быць не такімі некамфортнымі.

Акрамя псіхатэрапеўтычнага ўздзеяння ў эфекце абязбольвання ўдзельнічаюць многія іншыя фактары, у тым ліку фізічныя практыкаванні. Калі чалавек мае нейкае захворванне, гэта не азначае, што ён павінен мала рухацца ці абмяжоўваць сябе ў нейкіх сацыяльных функцыях. Наадварот, усе рэабілітацыйныя праграмы, распрацаваныя цяпер, накіраваны на стымуляцыю сацыяльнай, фізічнай актыўнасці. Ставіцца задача навучыцца жыць больш камфортна, нават маючы нейкае захворванне. Для нашага арганізма няма нічога немагчымага, яго рэзервы вельмі вялікія, і мы іх поўнасцю не выкарыстоўваем.

Вядомыя выпадкі, калі пацыенты сталага ўзросту ламалі бядро, былі нейкі час прыкаваны да ложка, а потым прыступілі да сістэмы трэніровак па спецыяльна распрацаванай праграме. Пазней яны гаварылі, што «хворая» нага ў іх на 40 гадоў «маладзейшая» за тую, якая не займалася і была здаровай.

Добра вядома як сродак барацьбы з болем роля адцягваючых фізіяпрацэдур. Патлумачу такім простым прыкладам: калі баліць галава, а мы ўдарылі па пальцы, то на галаўны боль забываемся. Гэта азначае, што ад болю можна адцягнуць увагу. Такую акалічнасць мы выкарыстоўваем у псіхатэрапіі. Вядома ж, мы не б'ём па пальцах, каб выратаваць ад галаўнога болю. Мы перамяшчаем увагу пацыента ў тое месца, дзе няма болю. Гэта можна зрабіць пры дапамозе фізіяпрацэдур. Напрыклад, такі прыём пры галаўным болі: трэба змясціць рукі пад гарачую ваду і хвілін 10—15 пагрэць, каб перараз-меркавалася кроў. Спосаб вельмі дапамагае пры мігрэні.

Увогуле пацыент з хранічным болем павінен лячыцца комплексна рыгадай урачоў, у складзе якой павінны быць тэрапеўт, псіхатэрапеўт або псіхіятр, псіхолаг, урач-рэабілітолаг ці фізіятэрапеўт, якія будуць выпрацоўваць сістэму рэабілітацыйных мерапрыемстваў для кожнага пацыента.

— Ці можа чалавек сам вызначыць той момант, калі са сваім болем яму трэба звярнацца да псіхатэрапеўта?

— Гэта варта зрабіць, калі боль носіць пакутлівы характар. Але ўсё роўна трэба прайсці медыцынскае даследаванне. У тым выпадку, калі боль суправаджае хранічнае захворванне, таксама варта звярнацца да спецыялістаў нашага профілю. Напрыклад, боль пры хранічным артрыце ці падагры. Хоць само захворванне псіхатэрапеўт не ўбярэ, ён навучыць пацыента, як спраўляцца з болевымі адчуваннямі.

Скажам, чалавеку прапануецца ацаніць свой боль у балах па 10-бальнай шкале. Напрыклад, ён ацэньвае яго ў 7—8 балаў. Пасля псіхатэрапеўтычных мерапрыемстваў пацыент ужо называе лічбу 3—4 балы. Гэта вельмі добры вынік нашай работы. Нават калі мы зніжаем узровень суб'ектыўнага ўспрымання болю на 1 бал — гэта таксама добра. Так крок за крокам мы рухаемся да мэты, якую намецілі.

Існуе шмат псіхатэрапеўтычных прыёмаў для работы з такім сіндромам, як боль. І вельмі важна памятаць, што добрыя зносіны, паўнацэннае харчаванне, усе пазітыўныя моманты, якія ёсць у жыцці, садзейнічаюць эфектыўнаму абязбольванню. Трэба пастаянна звяртаць свой позірк у знешні свет для таго, каб пераадолець стан болю.

Напрыканцы нашай размовы мы папрасілі Ірыну Анатольеўну Байкову падзяліцца некаторымі рэцэптамі, якія могуць дапамагчы пры такім вельмі частым болю, як галаўны. Такім чынам:

• пры пастаянных галаўных болях піце сок з сырой бульбы;

• таксама можна ачысціць і адварыць 1 кг бульбы без солі. Зліце ваду і ешце бульбу, на працягу дня, абмакваючы ў цукар (нельга пры цукровым дыябеце). У гэты дзень не піць. У мэтах прафілактыкі рабіце гэта раз у месяц;

• 10 г сухога святаянніку заліце адной шклянкай кіпеню і настойвайце. Прымайце па 1 ст. лыжцы 2—4 разы на дзень пасля яды;

• пры моцных пастаянных галаўных болях (калі няма рэзкага павышэння АД) рэкамендуецца: моцная гарбата, гарчычнікі на патыліцу і цёплыя нажныя ванны;

• 15 г сардэчніку заліць адной шклянкай кіпеню. Настойваць 2 гадзіны ў закрытым посудзе. Працадзіць. Прымаць па 1 ст. лыжцы 3—5 разоў на дзень. Пры доўгіх, моцных галаўных болях курс лячэння — 2—3 месяцы.

БЕРГМАН ЗАГАВОРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

Дакладней, фільмы легендарнага шведскага рэжысёра, якія будуць прадстаўлены ў фестывалі-рэтраспектыве «Падарожжа Бергмана на ўсход».

Пачнецца падарожжа з Брэста, дзе ў кінатэатры «Мір» можна будзе ўбачыць 8 ігравых фільмаў і адзін дакументальны, дзе майстар сам распавядае пра сваё жыццё. На наступны дзень да акцыі далучыцца Магілёў, кінатэатр «Радзіма». З 18 лютага фільмы Інгмара Бергмана можна будзе ўбачыць у мінскім кінатэатры «Перамога». Такія выдатныя сустрэчы нам падрыхтавала Аддзяленне Пасольства Швецыі ў Мінску сумесна з кінавідэапракатам трох беларускіх гарадоў.

Сустрэча сапраўды выдатная, калі ўлічыць, што прыцягвае само імя рэжысёра, які лічыўся элітным нават сярод эліты кінамастацтва. Пра яго не скажаш проста: быў уладальнікам «Оскара», таму што Інгмар Бергман меў своеасаблівы погляд на свет, на чалавека і на мастацтва. Пра гэта сведчаць яго фільмы — «Восеньская саната», «Мары», «Жанчыны ў чаканні», «Нічога не кажучы пра жанчын», «Лета з Монікай», «Шэпт і крыкі», «На краі жыцця» і, напэўна, самы вядомы «Фані і Аляксандр». Бергмана, які гаворыць на сваёй кінамове, трэба ўмець разумець. А вось каб гэта ў нас атрымалася найлепш, то ўсе фільмы будуць дэманстравацца на мове арыгінала з перакладам на беларускую. Гэта ў нас сёння таксама прыкмета элітарнасці і, напэўна, будзе пасаваць героям Бергмана. Такім чынам мы можам найлепш зразумець і самі сябе — праз мастацтва Бергмана. На жаль, ён сам пайшоў з жыцця летам мінулага года. Затое справа шведска-беларускага разумення дзякуючы яму набірае моц.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЗЛАЧЫНЦЫ ЗАТРЫМАНЫ. ПРАЗ ДВА ГАДЫ

Гэты разбойны напад шасцярых злачынцаў, якія былі ў чорных масках у дзвюх легкавушках, адбыўся ў 2005 годзе ў Добрушскім раёне. Ім нічога не змаглі супрацьпаставіць водзіцель, жанчына-касір і двое ахоўнікаў, якія везлі зарплату працаўнікам адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельскі горнаўзбагачальны камбінат» у суме 109 мільёнаў рублёў.

Пошукі злачынцаў вяліся бесперапынна, і сёння ўжо вядомы вынікі. Пяць разбойнікаў былі арыштаваны (сярод іх тры ўкраінцы) і чацвёра ўжо трапілі за краты. Пяты знаходзіцца пад следствам, а шосты, кіраўнік злачыннай групоўкі, як паведамілі нам у прэс-цэнтры УУС Гомельскага аблвыканкама, хаваецца ў Расіі. Часова, вядома ж.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.33	17.16	9.43
Віцебск —	7.26	17.02	9.36
Магілёў —	7.23	17.05	9.42
Гомель —	7.16	17.06	9.50
Гродна —	7.48	17.31	9.43
Брэст —	7.44	17.36	9.52

Месяц

Першая квадра.
Месяц у сузор'і Блізнят з 14.20.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Пятра, Трыфана.*
К. *Ліліяна, Валянціна, Кірылы, Мяфодзія.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

Дзве даты

14 лютага

1913 год — нарадзіўся Віталь Цвірка, вядомы беларускі жывапісец, народны мастак Беларусі. Асноўнае месца ў творчасці займае пейзаж. Сярод твораў: «Сакавік», «Разліў у Мінску». «Вечар у вёсцы», напісаў серыю партрэтаў удзельнікаў партызанскага руху. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1967).

1876 год — амерыканскі вынаходнік Аляксандр Бел прадэманстраваў першы бытавы тэлефон.

Цытата дня:

«Калі вы хочаце, каб вашу скаргу прачыталі, напішыце яе на адной старонцы».

Томас Вудра Вільсан (1856—1924), амерыканскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, 28-ы прэзідэнт ЗША, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру.

Усміхнёмся!

...Ён вяртаўся дадому з сімпозіума, весела грукаючы запінкамі па прыступках.

Прыйшла бабуля на кірмаш. Бачыць, мужык мяса прадае. Пытаецца ў яго:

— Колькі мяса каштуе, дараженькі?

— А ў вас, бабуля, валідол з сабою?

Прачытаўшы «Фауста» Гётэ, слесар Сідараў вырашыў прадаць душу д'яблу за кватэру на Кутузаўскім праспекце ў Маскве. На што д'ябал зарагатаў і сказаў, што такіх цэнаў даўно ўжо няма, і больш чым на бессмяротнасць Сідараў можа не разлічваць.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд за 7 лютага. Па гарызанталі: «Еўрабачанне». Чабан. Тур. Аляхно. Лары. Рок. Ляток. Колас. Ірга. Араты. Сад. Лог. Хата. Сабака. Гуд. Уран. Юта. Гама. Грам. Залева. Статар. Марс. Сані. Лапа. Пралом. Твор. Каза. Савет. Роба. Калдун. **Па вертыкалі:** Лаўр. Агурбаш. Тура. Хала. Адамсіт. Чын. Ост. Талон. «Рыба». Тар. Трап. Карл. Бунтар. Радавод. Урок. Зебу. Трыко. Асіна. Платан. «Лада». Вар. Багема. Сала. Авал. Ток. Маро. Агітбрыгада. Смолава.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.



8				5				9
		9		1	8		4	
7		4	9				5	8
		7						6
	6			4			9	
3						5		
5	2				6	4		7
	9		5	7		3		
4				2				5

СУДОКУ. У квадраце з 9 на 9 клетак трэба размясціць лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным гарызантальным радку, кожным вертыкальным слупку, а таксама ў кожным малым квадраціку 3 на 3 клеткі, абмежаваным тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

Час ад часу рашалькі задаюць пытанне: "А з чаго пачынаць рашэнне?". Па-рознаму трэба гэта рабіць. Хто пачынае з лічбы ў вуглавой клетцы, хто з групы лічбаў у нейкім месцы табліцы, хто бярэ за аснову нейкі радок ці слупок. Кожны рашальнік гэта робіць па-свойму.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 **№ 5 (256)**

Азотныя ўгнаенні

Злучэнні азоту, якія трапляюць у глебу, хутка вымываюцца талымі, дажджавымі і паліўнымі водамі. Таму азотныя ўгнаенні ўносяць толькі вясной пры пасадцы ў радкі або ў ямкі ці выкарыстоўваюць у выглядзе падкормак у першай палове лета, калі ідзе інтэнсіўны рост раслін. У другой палове лета патрэба раслін у азоце зніжаецца. Больш за тое, для шматгадовых культур лішак азоту нават шкодны — зацягваецца рост, і расліны не паспяваюць падрыхтавацца да зімы. Выключэнне складае гародніна, яка янаспынна пладаносіць да самай восені (агуркі, кабачкі, гарбузы, перцы, баклажаны), а таксама аднагадовыя кветкі, якія працягваюць цвісці — іх падкормліваюць да канца сезона. На дачным участку можна выкарыстаць такое каштоўнае азотнае ўгнаенне, як мача. Для падкормак мачу разбаўляюць вадой у 10 разоў і ўносяць 5—6 л вадкасці на 1 кв. метр.

Аміячная салетра — уносіцца вясной, злёгку падкісляе глебу.

Сульфат амонію — выкарыстоўваецца вясной, вельмі моцна падкісляе глебу.

Кальцыевая салетра — выкарыстоўваецца вясной — слаба падкісляе глебу.

Мачавіна (карбамід) — выкарыстоўваецца вясной, сярэдне падкісляе глебу.

Натрыевая салетра — уносіцца ў глебу вясной, слаба яе падкісляе.

Самы ранні ўраджай ягад

Яшчэ гадоў 20 таму мала хто цікавіўся такой раслінай, як бружмель (жимолость). Культура каштоўная тым, што дае ранні ўраджай пладоў. Яны выспяваюць раней, чым ягады суніц самых ранніх гатункаў.

Сінія прадаўгаватыя ягады бружмелю багатыя на біялагічна актыўныя рэчывы, галоўным чым Р-актыўнага дзеяння, вітаміну С яны змяшчаюць ад 70 да 90 мг на 100 г. Акрамя вітамінаў, ягады бружмелю змяшчаюць магній, натрый, калій, фосфар, кальцый, жалеза, а таксама мікраэлементы медзь, алюміній, ёд, марганец.

У перыяд выспявання ягад (5—10 дзён) змяняецца іх біяхімічны склад, і смак ягад бружмелю менавіта ў гэты час залежыць ад надвор'я. У сухое гарачае надвор'е ў ягадах павялічваецца колькасць дубільных і фарбуючых рэчываў, у некаторых гатункаў паяўляецца гарчынка. А вось у халаднаватае вільготнае надвор'е ў ягадах павышаецца кіслотнасць і павялічваецца колькасць вітамінаў.

Бружмель — зімастойкая культура. У гады, калі тэмпература паветра ў час цвіцення апускалася да мінусавай тэмпературы, расліна ўсё роўна пладаносіла. Важная станоўчая якасць ягадніка — устойлівасць кветак да веснавых замаразкаў. Гэта не хуткаплодная культура. Першыя ягады з'яўляюцца на трэці год пасля пасадкі, а поўнае плоданашэнне настае намнога пазней. Кусты да гэтага часу дасягаюць 1,5—2 м і вышэй. Адлегласць паміж саджанцамі пры пасадцы павінна быць не менш як 1,5, а лепш 2 м, бо бружмель разрастаецца. На адным месцы ён расце да 70 гадоў.

Бружмель — перакрыжаванаапыляльная расліна, таму на ўчастку павінна быць не менш як два гатункі, інакш ураджаю не будзе. Не купляйце саджанцы ад насеннага размнажэння. Ад іх вы атрымаеце горкія і нясмачныя ягады. Купляйце саджанцы, вырашчаныя з чаранкоў.

Бружмель раней за іншыя ягадныя культуры пачынае сваю вегетацыю, але і раней за іншыя яе заканчвае. Таму не палохайцеся, калі ў саджанцаў, асабліва вырашчаных з закрытай каранёвай сістэмай у парніках ці цяпліцах, у жніўні лісце будзе бурае. Гэта не хвароба, а паказчык таго, што расліна гатовая да зімы. Дрэнна, калі расліна выходзіць на зімоўку з нявыспелымі зялёнымі парасткамі.

Дзе зімуюць шкоднікі

Многія шкоднікі, якія пасяляюцца на садова-агародных участках, не пакідаюць іх нават зімой. Кожны іх від зімуе ў пэўнай фазе свайго развіцця. Напрыклад, тлі і медзяніцы, няпарны шаўкапрад, зімовая пядзеніца зімуюць у стадыі яйка. У стадыі лічынкі зімуюць драцянікі, хрушчы, мядзведкі. У стадыі кукалкі адпраўляюцца на зімоўку многія матылькі: капусная бялянка, соўкі, пладажэркі, капусныя і іншыя мухі. І, нарэшце, даўганосікі, каларадскія жукі, крыжакветныя блошкі праводзяць зіму ў стадыі дарослага насякомага.

Месцы зімоўкі шкоднікаў даволі разнастайныя. Звычайна гэта якія-небудзь укрыцці. Аднак яйкі медзяніц, шаўкапрада і некаторых іншых насякомых знаходзяцца на галінках дрэў і выжываюць нават у моцныя маразы. На пладовых дрэвах некаторыя вусені зімуюць у гнёздах з лісця, сцягнутых павуцінкай. Часцей за ўсё шкоднікі зімуюць у паверхневым слаі глебы. Тут знаходзяць схованку большасць жукоў і іх лічынак, кукалкі мух і савак, мядзведкі, яйкі смаўжоў і іншых шкоднікаў. Тыповыя месцы зімоўкі — кучы смецця, непрыбранае апалае лісце. Белакрылкі, некаторыя тлі і трыпсы могуць перазімаваць у сховішчах для агародніны.

Яблыневая медзяніца на галінках ў стадыі яйка.

Велізарную шкоду культурным раслінам наносяць хваробы, частай прычынай якіх з'яўляюцца грыбы. Гэтыя арганізмы зімы не баяцца. У глебе зімуюць узбуджальнікі чорнай ножні, кілы капусты, фузарыёзу пладовых і агародных культур. На раслінных рэштках захоўваюцца споры бурай плямістасці таматаў, антракнозу, паршы і пладовай гнілі семкавых, мучністай расы.

Каб знізіць страты ад шкоднікаў і хвароб, трэба праводзіць ахоўныя мерапрыемствы ўжо з восені. Перш-наперш варта прыбраць апалае лісце, раслінныя рэшткі і пустазелле. Гэты просты прыём дапаможа знішчыць запасы інфекцыі і пазбавіць месца зімоўкі многіх шкоднікаў. З пладовых дрэў неабходна зняць плады і лісце. Глебу перакопваюць на штык лапаты, у выніку чаго ўсе шкоднікі і ўзбуджальнікі хвароб раслін, якія зімуюць у паверхневым слоі глебы, перамясцяцца ў ніжнія, адкуль вясной ім не выбрацца.

Вусені баярышніцы зімуюць у гнёздах з сухога лісця на дрэвах...

Пры пасадцы пад зіму трэба выкарыстоўваць толькі здаровы пасадачны матэрыял. Ствалы дрэў варта абгарнуць руберойдам або шчыльнай паперай, каб абараніць ад грызуноў. На тэрыторыі ўчастка, падрыхтаванага да зімы такім чынам, застаецца мінімальная колькасць шкодных арганізмаў. Неацэнную дапамогу ў барацьбе са шкоднікамі дрэў аказваюць птушкі, асабліва сініцы, папаўзні, пішчухі. Развешваючы на працягу зімы кармушкі, можна прыцягнуць іх на ўчастак.

Вясной (у сакавіку—красавіку) ствалы пладовых дрэў неабходна апрацаваць растворам вапны. Для гэтага 1,5—2 кг гашанай вапны разводзяць у 8—10 л вады, каб раствор не сцякаў уніз, а прыліпаў, дадаюць 200—300 г мучнога клейстару. Карысна гэтым саставам апырскаць і галінкі. Перад пабелкай ствол ачышчаюць ад бруду, лішайнікаў і кавалкаў адсталай кары.

...а крыжакветныя блошкі ў верхнім слоі глебы.

Як толькі глеба пачынае прагравацца, з укрыццяў выпаўзаюць галодныя насякомыя. Першымі з'яўляюцца яблыневыя дайганосікі, якія пералятаюць на галінкі яблыні і пашкоджваюць пупышкі. Праз некаторы час самка адкладвае да 100 яек — па аднаму ў бутон. Барацьбу з гэтым шкоднікам трэба пачынаць неадкладна, як толькі дзённая тэмпература дасягне плюс 8—10 градусаў. Для гэтага раніцай, калі яшчэ холадна, пад яблыняй трэба разасцаль старую поліэтыленавую плёнку, ці брызнуць і затым моцна патрэсці дрэва. Жукі падаюць уніз, дзе іх лёгка сабраць. Гэту аперацыю трэба праводзіць як мага часцей. Безумоўна, усё-такі найбольш эфектыўная апрацоўка хімічнымі прэпаратамі.

На кустах чорных парэчак пачынаюць набухаць пупышкі. Некаторыя з іх моцна павялічыліся, але не распускаюцца. Гэта значыць, што куст пашкоджаны парэчкавым кляшчом, барацьбу з якім весці складана. Пашкоджаныя пупышкі проста «нашпігаваныя» мікраскапічнымі кляшчамі, а калі парэчкі зацвітуць, яны пяройдуць на здаровыя. Можна толькі параіць абрэзаць моцна паражоныя парасткі з «тоўстымі» пупышкамі. Лепшы спосаб барацьбы з гэтым небяспечным шкоднікам — вырошчваць устойлівыя гатункі парэчак.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд за 9 лютага. Па гарызанталі: Гамбургер. Аброк. Ядро. Агат. Марс. Тля. Рунь. Фтор. Лак. «Манас». Дранікі. Гар. Бэра. Аман. Піца. Шашлык. Сінап. Абабак. Ласо. Аматар. Нуда. Док. Агарак. Каза. Разлад. Кіно. Бак. Міндаль. **Па вертыкалі:** Вінаград. Пісар. Анчар. Ціс. Анод. Ліга. Опера. Асака. Шпак. Град. Кірза. Казка. Брас. Шпага. Лік. Мурог. Збан. Акт. Дом. Кут. Кара. Ярмо. Барана. Тандэм. Бур. Расада. Яешня. Стан. Кактэйль.

Паважаную ***Іну Валер'еўну АСТРЭЙКА*** *віншуем з днём нараджэння.*

Жадаем моцнага здароўя і няхай тваё сэрца заўсёды будзе напоўнена цяплом, святлом, дабрынёй і любоўю родных і сяброў.

Сябры, калегі, *г. Старыя Дарогі.*

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць факт